Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

28 ЖНІЎНЯ 2021 г. СУБОТА № 165 (29534)

УЛАДЗІМІР ЦАРУК— ЛЕГЕНДАРНАЯ АСОБА 10

ЖУРНАЛІСТ У АДКАЗЕ ЗА СВАЕ СЛОВЫ. 11

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ТУРЧЫН, старшыня Мінаблвыканкама:

«За апошні час многае змянілася, але не памянялася адно: жаданне настаўнікаў дзяліцца з юнымі беларусамі ведамі і фарміраваць іх асобы. Гэтыя складнікі педагагічнай працы з'яўляюцца трывалай асновай паспяховага развіцця любога грамадства на любым гістарычным этапе. Задач на наступны год шмат. Адна з іх — неабходнасць фарміраваць светапогляд у падрастаючага пакалення. На гэтай аснове трэба будаваць працэс навучання і выхавання. Гэта цяжкая задача. Тут павінны працаваць не толькі настаўнікі, але і бацькі. Да таго ж важна разумець: педагогі — не абслуговы персанал, а адукацыя — не паслуга, якую вы набываеце. Усвядоміўшы гэта, стаўшы разам з педагогамі строгімі, але справядлівымі настаўнікамі, бацькі змогуць зрабіць з дзіцяці развітую асобу».

Золата зямлі беларускай

«З уводам Петрыкаўскага горна-абагачальнага комплексу мы ўзмацняем свае пазіцыі на сусветным калійным рынку»

Падчас візіту Прэзідэнта ў Гомельскую вобласць уведзены ў эксплуатацыю Петрыкаўскі ГАК



Фота БелТА.

Будаўніцтва Петрыкаўскага горна-абагачальнага камбіната — адзін з найважнейшых інвестыцыйных праектаў ААТ «Беларуськалій», старт якому дадзены быў яшчэ ў 2012 годзе. Сёння вытворчыя магутнасці ўсяго прадпрыемства — 13,5 мільёна тон калійных угнаенняў у год. З уводам Петрыкаўскага камбіната да 2025 года плануюць здабываць ужо 15,5 мільёна тон. Праектныя магутнасці дазваляюць ствараць 1,5 мільёна тон хларыду калію ў год, а ў пазітыўных планах кіраўніцтва — і 2 мільёны тон.

СТАР. 2

КАРАТКА

• Беларусь у першым паўгоддзі павялічыла экспарт прадуктаў харчавання ў Турцыю амаль у 5 разоў.

• **Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур пройдзе 11 верасня ў Мінску.**

• У Даніі 10 верасня адменяць уведзеныя з-за COVID-19 абмежаванні. Ва ўрадзе гэтай краіны запэўнілі, што інфекцыя больш не пагражае грамадству.

• **Асабліва небяспечнага злачынца з Беларусі затрымалі ў Санкт-Пецярбургу пасля 22 гадоў вышуку.**

• З 2022 года beCloud будзе выконваць функцыі тэхнічнага адміністратара нацыянальнай даменнай зоны.

• **Колькасць крадзяжоў грошай з банкаўскіх рахункаў у 2021 годзе павялічылася больш чым на 70 %.**

ISSN 1990 — 763X

Захад-2021

ІСПЫТ НА ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ

Карэспандэнты «Звязды» сустрэліся з вайскоўцамі, якія будуць удзельнічаць у вучэнні «Захад-2021»

Сумеснае стратэгічнае вучэнне, якое пройдзе з 10 да 16 верасня, стане выпрабаваннем на прафесіяналізм для ўсіх ваеннаслужачых — пачынаючы ад генерала, заканчваючы радавым. Падрыхтоўка да беларуска-расійскіх манеўраў ідзе поўным ходам. Ужо прыбылі вайскоўцы з Расіі. Нашы армейцы, у сваю чаргу, абсталёўваюцца на расійскіх палігонах — некаторыя этапы вучэння будуць ажыццёўлены на тэрыторыі суседзяў.

Каб даведацца, наколькі беларускія вайскоўцы гатовы да галоўнага іспыту двухгоддзя, мы наведалі 230-ы агульнавайсковы палігон, дзе неўзабаве разгорнуцца набліжаныя да рэальных баявыя дзеянні. На шчасце, працівнік у нашых, а таксама ў расійскіх ваеннаслужачых будзе ўмоўны.

Фота Аліны МАЗАВЕЦ.

СТАР. 4-5

«Звязда» даследуе праблему

«Вада лілася ў агарод каскадам...»

Як жыхары і ўлады супрацьстаяць патопам у самым «мокрым» аграгарадку пад Гроднам

Вядомасць на ўсё наваколле Путрышкі Гродзенскага раёна атрымалі з-за беспрэцэдэнтных патопаў падчас летніх ліўняў. Літаральна па пояс у вадзе аказаліся жыхары вуліц Фестывальная, Тарханава і Вачынскай. Для адпампоўвання вады спецыяльная тэхніка МНС мусіла прыязджаць некалькі разоў на дзень. Лівень пакінуў пасля сябе даволі жудасныя наступствы. Нядаўна сюды прыязджала спецыяльная камісія, каб на месцы вырашыць, як дапамагчы жыхарам і прадухіліць у далейшым разбуральныя вынікі воднай стыхіі.

СТАР. 7

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Золата зямлі беларускай

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Петрыкаўскі ГАК дае магчымасці працаўладкаваць амаль 1300 чалавек. Пакуль калектыў сфарміраваны часткова — 850 чалавек. Але не бядуюць — справа часу. У Петрыкаў едуць працаваць не толькі з Гомельшчыны, але і з усёй Беларусі. Прычына таму і прэстыжнасць прафесіі шахцёра, і належныя заробкі, і ўвага кіраўніцтва кампаніі да развіцця сацыяльнай сферы. Прыцягваецца ў рэгіён моладзь. Для працоўных пабудаваны 12 дамоў на 618 кватэр, жыллё атрымлівае амаль кожны супрацоўнік. Здадзены дзіцячы садок, выдзелены сродкі на рэканструкцыю раддома, плануецца будаўніцтва спарткомплексу з басейнам. Для футбольнай каманды «Шахцёр» Петрыкаў стварылі выдатнае поле. У доказ эфектыўнасці намаганняў і прывабнасці працы на ГАК сярэдні ўзрост супрацоўніка — 33 гады.

«НЕАБХОДНА ПАДТРЫМЛІВАЦЬ ПАЛЕССЕ»

Прэзідэнт акцэнтуе: важна, што «Беларускалій» дапамагае развіваць рэгіёны, але і ў самога прадпрыемства хапае праблем.

«Давай дамовімся, што першыя два гады хоць бы паўмільёна даляраў у год, а трэці, чацвёрты, пяты — па мільёне тут трэба даваць. Але не грашыма. Вы з кіраўніком райвыканкама сядзьце і паглядзіце, што неабходна зрабіць. Гэтую тэрыторыю неабходна развіваць. Палешукі ў нас не абдзелены ўвагай, але мы занадта іх тут не ўзбагацілі. Неабходна падтрымліваць Палессе», — сказаў кіраўнік краіны Івану Галаватаму, генеральнаму дырэктару ААТ «Беларускалій».

Як ён працягнуў, такім чынам, частка Палесся ад Мазыра да Пінска будзе добраўпарадкавана. Асабліва павінны дадаць Петрыкаў і Жыткавічы.

Іван Галаваты расказаў, як ішло будаўніцтва аб'екта, як развіваецца сацыяльная сфера на прадпрыемстве і наколькі хопіць беларусам іх зямнога багацця.

«З улікам Петрыкаўскага радовішча запасаў беларускіх соляў хопіць больш чым на 120 гадоў. Дарасінскі руднік мы будзем здаваць у 2027 годзе. З улікам сучаснай тэхнікі раскрываем новыя гарызонты, плануем да 2030 года да 16 мільёнаў тон давесці выпуск калійных угнаенняў», — паведамляе гендырэктар.

Ён дадаў, што экспарт калійных угнаенняў павялічваецца на 10 %. Сёлета за 7 месяцаў выручка ад рэалізацыі павысілася на 26 %, павялічыўся ў два разы прыбытак.

Губернатар Гомельшчыны Генадзь Салавей расказаў Прэзідэнту, што робіцца для прыстойнага жыцця ў раённых цэнтрах рэгіёна.

«У мінулым годзе мы зрабілі Мазыр, на якім затрацілі 88 мільёнаў, а ў гэтым 12. Дабудуем да канца года садок. Прыступілі да Добруша. Добруш аднаўляем, у наступным годзе зробім яго належным для жыцця людзей», — паведаміў губернатар.

Прэзідэнт прапануе ідэі для рэнавацыі закінутых плошчаў (заводаў, не патрэбных ферм). «Ёсць пляцоўкі, падведзены камунікацыі. Электрычнасці хопіць на ўсіх на перспектыву. Вазьмі пабудуй цяпліцу — самае простае. І няхай работнікі там займаюцца, а як вырашаць, так і размяркуюць гэту прадукцыю. Навошта закідваць гэтыя пляцоўкі?» — задае рытарычнае пытанне Прэзідэнт.

ГІСТАРЫЧНЫ ДЗЕНЬ

Гэты дзень кіраўнік краіны назваў гістарычным для Беларусі, бо адкрываецца чарговы знакавы аб'ект.

«Запасаў калійнай руды, па вашых ацэнках, тут хопіць на 100 гадоў, на цэлае стагоддзе. ***Калій — брэнд нашай краіны. Нам пашанцавала, што айчынныя нетры багатыя чырвоным золатам. Попыт на яго велізарны і расце год ад году»,*** — сцвярджае Прэзідэнт.

Такі ажыятаж на рынку ён тлумачыць запытам на харчаванне: каля мільярда чалавек не даядае, паўмільярда галадае.

«Харчаванне — гэта зямля, глеба. А без угнаенняў ніякага харчавання быць не можа. Таму запыт на ўгнаенні ўвогуле, і калійныя ў тым ліку, у свеце расце і будзе расці», — дадае Прэзідэнт.

Па яго словах, «Беларускалій» — адзін з вядучых гульцоў на сусветным рынку ўгнаенняў, займае ў ім больш за 20 %. Але галоўнае, акцэнтуе кіраўнік краіны, «Беларускалій» — самы надзейны партнёр у свеце, і яго, дзяржаўную кампанію, выбіраюць для супрацоўніцтва з году ў год.

«І мы ніколі не падводзілі і не падвядзём сваіх партнёраў. Нават у тых умовах, што нам сёння стварае калектыўны Захад. Нас выпрабоўваюць на трываласць разнастайнымі санкцыямі ЗША, краіны ЕС, калі беглыя апазіцыянеры гэтыя санкцыі выпрошваюць. І ў гэты час мы нікога не падводзілі. Мы выканаем свае абавязкі і ўвесь створаны тавар у Беларусі прададзім, чаго б гэта нам ні каштавала», — заяўляе Аляксандр Лукашэнка.

У час санкцый кампанія шукае новыя рынкі паставак, новыя магчымасці дастаўкі тавараў. У нашых калійных угнаеннях зацікаўлены Кітай, Бразілія, Індыя і іншыя краіны, а гэта палова насельніцтва планеты.

У калійных угнаеннях, заўважае Прэзідэнт, мае значную праблему суседняя Украіна. І, нягледзячы на палітычныя праблемы, вядуцца перагаворы, каб захаваць эканамічныя сувязі з ёй.

«Свет вялікі, і з-за пандэміі каранавіруса на планеце яшчэ вастрэй устала пытанне забеспячэння харчаваннем, а адпаведна, і ўгнаеннямі. І нам, беларусам, працавітым людзям з мазгамі, цяжка паверыць, што праблема голаду актуальная ў XXI стагоддзі. Тым не менш гэта так. Таму з уводам Петрыкаўскага горна-абагачальнага комплексу мы ўзмацняем свае пазіцыі на сусветным калійным рынку», — сказаў Прэзідэнт.

❍ Каментарый у тэму

Іван ГАЛАВАТЫ, генеральны дырэктар «Беларускалія»: «Толькі ў Беларусі гэта галіна захавала сябе, пачынаючы ад праектавання, працягваючы шахтабудаваннем і заканчваючы здабычай і перапрацоўкай руды. Гэта, сапраўды, гонар былога Савецкага Саюза. Ацэньваючы маштабы будаўніцтва, рэалізаваныя ў Петрыкаўскім раёне, можна сказаць, што праграма, зацверджаная на VI Усебеларускім народным сходзе аб сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі на 2021—2025 гады, рэалізавана на гэтай зямлі. Асноўныя мэты праграмы — стабільнасць у кожнай сям'і, магчымасць для рэалізацыі, доступ да медыцынскай сферы, адукацыі. Сёння, улічваючы сярэдні ўзрост калектыву, а ён складае 33 гады, я ўпэўнены, што ён яшчэ парадуе сваімі працоўнымі поспехамі і дасягненнямі».

Але, што важна, паводле яго, увесь Петрыкаўскі раён атрымлівае новы стымул для развіцця і, верагодна, хутка дагоніць Салігорск па ўмовах жыцця.

«Ужо зроблена нямала. На добраўпарадкаванне горада выдзелена каля 50 мільёнаў рублёў, абноўлена амаль уся яго інфраструктура. Я хачу, каб петрыкаўцы разумелі, што гэтыя грошы сабралі з усёй краіны. І ў гэтым перавага нашага сацыяльнага ўкладу і развіцця, калі пакрыху ствараем апорныя крокі развіцця нашай дзяржавы», — канстатуе кіраўнік краіны.

МІЖ ТЫМ...

Не абышоў Прэзідэнт і праблемы спартыўнай сферы. Пажурыў хакеістаў, якія прайгралі Польшчы ў матчы кваліфікацыі на Алімпійскіх гульнях.

«У Польшчы ў хакей гуляюць 20 чалавек — і тым прайгралі. Такая ганьба. Я не прыніжаю палякаў, яны прыгажуны, пераўзышлі вялікіх. Мы іх спансіруем, а дайце сярэдні заробак, хай гуляюць. А калі будзе вынік, нешта дададзім. Так і па футбалістах. А то ў нас атрымалася так, што тыя крыўляюцца, гуляюць, а жонкі ў іх прыгажуні ў айфонах сядзяць і супраць дзяржавы ваююць», — абураецца Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў сваё асаблівае стаўленне да жыхароў палескага рэгіёна. «Ведаеце мае адносіны да палешукоў. Палессе — гэта соль беларускай нацыі. Тут сапраўдныя беларусы жывуць».

Аляксандр Лукашэнка адзначае, што ўжо зроблена шмат у Жыткавічах, Тураве, а Петрыкаў некалькі адставаў.

Існуе праблема, што новы ГАК перахопіць працоўную сілу ў сельскай гаспадаркі.

«Мы стварылі добрыя працоўныя месцы, дзе можна зарабляць грошы. Але атрымалі іншую праблему — недахоп працоўных рук вакол. Мы чакаем украінцаў тут. Я намякаю дэпутату парламента ўкраінскага (*Яўген Шаўчэнка прысутнічаў у зале.* — **«Зв.»**), — дадае Прэзідэнт і нагадвае, што ўсім украінцам і расіянам, што жывуць у Беларусі, дадуць да канца года грамадзянства. — Нам вельмі неабходныя зараз рабочыя рукі. Не толькі ў сельскай гаспадарцы. Задума была такая: развіць Прыпяць, Палескі край. І гэта жамчужына, якую мы дбавалі каля 10 гадоў, якраз укладваецца ў гэту задуму».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што пабудуюць для супрацоўнікаў ГАК каля 800 кватэр. 1 верасня пачне працаваць сучасны дзіцячы садок на 240 месцаў. Але гэта не проста садок, а сапраўдны цэнтр для дашкольнага развіцця.

«Там будуць самыя развітыя дзеці. Такіх цэнтраў у свеце ніхто не стварае. Толькі ў нашай сацыялістычнай Беларусі, як кажуць. Хай называюць як хочуць, але дзеці ў нас будуць у палацы вучыцца. Такіх цэнтраў у Беларусі няшмат налічым», — сказаў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт падзякаваў усім, хто меў дачыненне да ўзвядзення камбіната: будаўнікам, праекціроўшчыкам, шахцёрам. На яго затрацілі каля 1,25 мільярда даляраў, сэканоміўшы больш за 200 мільёнаў.

«Я адчуваю гонар за ўсіх вас, выдатных спецыялістаў і майстроў сваёй справы. Работы выконваліся выключна беларускімі падраднымі, праектнымі, будаўнічымі, мантажнымі арганізацыямі. А доля айчыннага абсталявання склала каля 90 працэнтаў. То-бок усё зрабілі самі, сваімі матэрыяламі», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

Адкрыццё камбіната прымеркавана да Дня шахцёра, які адзначаюць у апошнюю нядзелю жніўня. Таму асаблівыя словы падзякі і пажаданні Прэзідэнт накіраваў працаўнікам і да прафесійнага свята.

Па яго словах, сёння калійныя шахты дапамагаюць не толькі здабываць угнаенні, але і лячыць у спелеакамерах хворых.

«Шмат шахцёры падарылі Беларусі, не кажу пра тое, што дапамагаюць і спорту, і ахове здароўя. Вы малайцы. Шчыры вам дзякуй», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Напрыканцы ён заўважыў, што ўвесь свет — ад Украіны да Кітая — перажывае цяжкія часы.

«І вы павінны разумець, што нас ніхто не чакае. А калі і чакае, то на плантацыях — збіраць клубніцы. Дык лепей у сябе вырошчваць і ў свабодны час займацца карыснай працай, — мяркуе кіраўнік краіны. — Цаніце сваю зямлю. Лепшага краю, як Беларусь, асабліва ў вас тут, на Палессі, у свеце няма. А мы будзем стараццца ствараць для вас умовы, каб вы маглі карміць сваіх дзяцей».

Марыя ДАДАЛКА,
Петрыкаўскі раён.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Джо Байдэн заявіў, што ў поўнай меры нясе адказнасць за апошнія падзеі ў Афганістане

«Я ў поўнай меры нясу адказнасць за ўсё, што адбылося апошнім часам», — заявіў Байдэн, выступаючы ў Белым доме.

Такім чынам прэзідэнт ЗША адказаў на пытанне пра тое, ці ляжыць на ім адказнасць за гібель 12 амерыканскіх ваеннаслужачых пры выбухах каля аэрапорта Кабула.

Байдэн падкрэсліў, што прытрымліваецца свайго рашэння вывесці амерыканскія войскі з Афганістана да 31 жніўня. Злучаныя Штаты ўжо эвакуіравалі больш за 100 тыс. чалавек з Афганістана за апошнія 11 дзён. Прэзідэнт удакладніў, што загадаў вайскоўцам распрацаваць планы ўдараў па аб'ектах і кіраўніцтве афганскага аддзялення групоўкі «Ісламская дзяржава». Амерыканскі лідар лічыць, што талібы не дапамагалі баевікам у арганізацыі тэракта. Самі талібы рашуча асудзілі тэракт і паабяцалі прыцягнуць вінаватых да адказнасці.

Раней паведамлялася, што серыя выбухаў, зладжаная тэрарыстамі-смяротнікамі, 26 жніўня забрала больш чым 110 чалавечых жыццяў у раёне аэрапорта Кабула і самой сталіцы краіны.

У Крамлі асудзілі плакаты з Калінінградскай вобласцю ў складзе Германіі

У Маскве негатыўна ўспрынялі з'яўленне на вуліцах горада Цецераў агітацыйных плакатаў з Калінінградскай вобласцю ў складзе ФРГ.

Як падкрэсліў прэс-сакратар прэзідэнта Расіі Дзмітрый Пяскоў, гэтая акцыя не мае дачынення да пазіцыі ўладаў Германіі.

«Афіцыйна Берлін не падвяргае сумневам тэрытарыяльную цэласнасць Расіі», — дадаў ён. Пяскоў удакладніў, што гэтая сітуацыя дазволіла зразумець, якія тэрытарыяльныя памкненні ёсць сярод нямецкіх палітычных сіл. Раней у нямецкай федэральнай зямлі Мекленбург — Пярэдняя Памеранія развесілі копіі перадвыбарных плакатаў 1949 года з картай Германіі ў даваенных граніцах.

Як паведамілі ў пракуратуры Ростака, там вывучаць сітуацыю, цяпер матэрыялы знаходзяцца ў паліцыі горада Цецераў, дзе з'явіліся плакаты. Пакуль іх паходжанне застаецца невядомым. Сучасная Калінінградская вобласць знаходзіцца на частцы тэрыторыі былой нямецкай правінцыі Усходняя Прусія. Тут праходзіла наступальная аперацыя савецкіх войск, у выніку якой Чырвоная Армія вызваліла паўночную частку Польшчы. Пасля Другой сусветнай вайны па рашэнні Патсдамскай канферэнцыі краін антыгітлераўскай кааліцыі большая частка Усходняй Прусіі ўвайшла ў склад Польшчы, трэць тэрыторыі са сталіцай Кёнігсбергам перайшла СССР.

Дэльфіны дапамаглі выратаваць мужчыну, які дрэйфаваў 12 гадзін у ледзяной вадзе

Дэльфіны ў ірландскім заліве Тралі дапамаглі выратаваць плыўца, які 12 гадзін дрэйфаваў у ледзяной вадзе, паведамляе Daily Mail.

Паводле паведамлення, берагавая ахова звярнулася па дапамогу ратавальнікаў пасля таго, як на пляжы знайшлі адзенне плыўца.

На дапамогу мужчыну адправілася выратавальная лодка, пазней да пошукаў падключыліся верталёты. Ірландца ва ўзросце каля 30 гадоў знайшлі за чатыры кіламетры ад берага больш чым праз 12 гадзін пасля таго, як ён пачаў заплыў. Плыўца акружалі дэльфіны. Пацярпелага даставілі з вады і даставілі на бераг, дзе яго агледзелі ўрачы хуткай дапамогі. Плывец быў знясілены і пакутаваў ад пераахаладжэння. Выратаваны заявіў, што спрабаваў праплысці дыстанцыю ў 10 кіламетраў ад берага, але аказаўся дрэнна падрыхтаваны да заплыву.

Каманда ратавальнікаў лічыць, што дэльфіны дапамагалі ў выратаванні мужчыны. Ратавальнік-валанцёр Джэкі Мэрфі назвала цудам той факт, што мужчына застаўся жывы.

Дабрачыннасць

ШКОЛЬНЫ БАГАЖ — У ПАДАРУНАК

Напярэдадні вучэбнага года ў Лідскім замку прайшло свята для дзяцей з няпоўных сем'яў

Мерапрыемства зладзіў Беларускі саюз жанчын пры падтрымцы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, а таксама мясцовых улад. Сустрэча стала адным з этапаў рэспубліканскай акцыі «Збяром партфель разам», што праходзіць на працягу жніўня. Гэтым разам арганізатары аказалі дапамогу дзецям Лідскага раёна, якія выхоўваюцца адной маці альбо адным татам.

Па словах **першага намесніка грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» Святланы СІТНІКАВАЙ,** дабрачыннай акцыяй у краіне ахоплена не адна тысяча сем'яў. У кожнай вобласці арганізацыя мяркуе выдаткаваць на гэтыя мэты каля 20 тысяч рублёў. Кожнае мерапрыемства праходзіць па-свойму. Напрыклад, многія шматдзетныя сем'і атрымалі падарункі дома. У некаторых выпадках ладзяцца масавыя сустрэчы.

— Гэта свайго роду дабрачынны марафон, у рамках якога ёсць магчымасць дапамагчы дзецям, асабліва ў шматдзетных, маламаёмных сем'ях, дзе некалькі школьнікаў. Падрыхтаваць іх да вучэбнага года бывае складана. На гэты раз у Лідзе сабраліся няпоўныя сем'і, у якіх дзеці засталіся альбо з маці, альбо з татам. Для школьнікаў мы падрыхтавалі неабходныя канцтавары, спартыўны інвентар, пачастункі. Бацькі атрымалі сертыфікаты для набыцця неабходных тавараў, — расказала Святлана Сітнікава.

Прадстаўнік жаночай арганізацыі адзначыла, што вельмі важна, каб дзеці адчулі сапраўднае свята. Так і атрымалася. Лідскі замак стаў святочнай пляцоўкай з гульнямі, забавамі і рыцарскімі турнірамі. Быў зладжаны і салодкі стол. Для малодшых дзетак цікавую праграму падрыхтавалі мімы і клоўны.

Шасцігадовы Аляксей Нічыпарчык з гордасцю заявіў, што хутка стане школьнікам. На свята ён прыйшоў са сваёй маці Анастасіяй і малодшай сястрой. У сям'і трое дзяцей, якія вясной гэтага года засталіся без таты. Лётчык Андрэй Нічыпарчык разам са сваім напарнікам Мікітам Куканенкам адвялі ад населенага пункта няспраўны самалёт, але самі загінулі. Родныя, калегі, сябры робяць усё магчымае,

каб падтрымаць шматдзетную сям'ю. Далучаюцца і грамадскія арганізацыі.

Увогуле, для шматдзетных сем'яў прадугледжана значная фінансавая падтрымка да новага вучэбнага года. Так, у рамках дзяржаўнай праграмы «Дэмаграфічная бяспека і здароўе нацыі» школьнікам выдаткавана 22 мільёны рублёў. Толькі адраснай дапамогі шматдзетным накіравана звыш 12 мільёнаў рублёў. Аб гэтым паведаміў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый Кавалькоў.

Не застаюцца ўбаку і мясцовыя ўлады, праінфармавала старшыня Лідскага райсавета Інеса Белуш. Напрыклад, у жніўні дапамогу атрымалі 3,5 тысячы дзяцей Лідчыны на агульную суму 214 тысяч рублёў. Да гэтага трэба дадаць і дапамогу з іншых крыніц, грамадскіх арганізацый. Свята ў Лідскім замку якраз з ліку такіх прыемных падзей.

Дзевяцікласнік Кірыл і шасцікласнік Станіслаў Запаснікі каля сцен замка захапіліся стральбой з лука. А яшчэ яны любяць займацца конным спортам у роднай вёсцы, наведваюць у школе гурткі. Іх бацька Аляксандр Мечыслававіч задаволены, што сям'я атрымала столькі карысных падарункаў да школы. Так здарылася, што ён адзін выхоўвае сыноў. Але дапамогу адчувае пастаянна. Як з боку дзяржавы, так і мясцовай сельгаспадаркі, дзе працуе. Цяпер яны жывуць у добраўпарадкаваным саўгасным доме, а нядаўна атрымалі і кватэру ў Лідзе.

Дарэчы, апошнім часам нямала ўвагі ўдзяляецца менавіта ўдзелу таты ў выхаванні дзяцей. **Старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага саюза жанчын Ірына СЦЕПАНЕНКА** паведаміла, што ў Гродне нядаўна адкрылі Школу паспяховых татаў, дзе займалася больш 30 чалавек. Пакуль таты слаба задзейнічаны ў гэтым руху, але сітуацыя паступова мяняецца. Гэтаму спрыяе і заканадаўства.

— Раней усе льготы датычыліся толькі маці. Зараз яны распаўсюджваюцца і на татаў, — падкрэсліў Валерый Кавалькоў. — Напрыклад, у 3-гадовым водпуску па доглядзе дзіцяці можа знаходзіцца як маці, так і бацька, прычым чаргавацца з любой працягласцю. Праўда, таты мала скарыстоўваюць такую магчымасць. У краіне такіх толькі 1 %, гэта тры тысячы чалавек, а дзяцей да трох гадоў — 300 тысяч. Магчыма, усе прывыклі, што жанчына больш звыклая ў ролі маці і гаспадыні.

Між тым падтрымка аказваецца ў шырокім спектры, дадаў прадстаўнік міністэрства. Гэта і сацыяльная дапамога, і жыллёвая палітыка, і падатковае заканадаўства. Напрыклад, у маці альбо бацькі, якія знаходзяцца ў дэкрэтным водпуску, гарантаваны кантракт па месцы працы на пяць гадоў. Зараз вырашаецца пытанне ў адносінах сямейнага капіталу для шматдзетных сем'яў. З 2015 года гэтыя сродкі атрымалі каля 100 тысяч сем'яў, 30 тысяч ужо выкарысталі фінансавую дапамогу. Па словах Валерыя Кавалькова, ёсць праект указа, які ўносіць змяненні ў праграму сямейнага капіталу па пашырэнні яго выкарыстання.

Маргарыта УШКЕВІЧ,
г. Ліда.
Фота аўтара.

Алімпійскі дзённік

Новы дзень — новае «золата» Ігара Бокія

Параалімпійскія гульні ў Токіа набіраюць абароты. І ўсё актыўней на галоўных стартах выступаюць беларусы.

Фота БелТА.

Ігар Бокій у катэгорыі S13 на дыстанцыі 400 метраў вольным стылем у фінале прыплыў да фінішу першым. Яго вынік — 3 хвіліны 58,18 секунды. Гэта трэці залаты медаль Ігара на Гульнях у Токіа. І 14-ы залаты медаль Параалімпіяды ў кар'еры.

З трэцім «золатам» плыўца павіншаваў міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук. «У фінальным заплыве ты зноў быў найлепшым. Трэцяе «золата» запар выклікае захапленне і павагу. Гэты поспех стаў годнай узнагародай за твой талент і ўпартасць. Ты ўжо ўпісаў сваё імя ў гісторыю Параалімпійскага руху. Заставайся лідарам, дасягай максімальных вышынь і не спыняйся на дасягнутым. Мы ганарымся тваімі гучнымі перамогамі на плавальных дарожках Токіа. Жадаю табе новых поспехаў і здзяйсненняў, — прыводзіць словы міністра прэс-служба Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь.

Наталля Шавель у класе S5 на дыстанцыі 50 метраў батэрфляем у папярэднім заплыве заняла пятае месца з вынікам 50,19 секунды. На жаль, гэтага выніку не хапіла, каб выйсці ў фінал. Спартсменка размясцілася на 10-й пазіцыі выніковага пратакола.

ЦІКАВЫ ФАКТ. Пасля першых Параалімпійскіх гульняў у спаборніцтвах па плаванні ўдзельнічала ўсё больш спартсменаў. У 1976 годзе ўпершыню ў заплывах прынялі ўдзел людзі з ампутаванымі канечнасцямі і слабавідушчыя. Плыўцы, якія пакутуюць на цэрабральны параліч, упершыню спаборнічалі ў Арнэме ў 1980 годзе. У Сіднэі ў 2000 годзе ў праграму былі ўключаны плыўцы з інтэлектуальнымі парушэннямі.

ПАРАВЕСЛАВАННЕ. Людміла Воўчак у лодцы-адзіночцы ў папярэднім заездзе заняла пятае месца. Гэтага выніку не хапіла для выхаду ў фінал. Таму Людміла будзе стартаваць у суцяшальным заездзе.

Веславанне, якім захапляўся сам заснавальнік Алімпійскіх гульняў барон П'ер дэ Кубертэн, было часткай усіх Алімпіяд. Параваславанне — навічок у параалімпійскім спорце. Першыя чэмпіянаты свету былі праведзеныя менш за 20 гадоў таму, а ў 2008 годзе гэты від спорту дэбютаваў на Параалімпійскіх гульнях у Пекіне.

Валерыя СЦЯЦКО.

Брэнды рэгіёнаў

Фестывалі ад «А» да «Я»

Ці ведалі вы, што ў Шклове святкуюць дзень агурка? Падчас тэматычнага свята можна пачаставацца нават агурковым махіта. А мястэчка Глыбокае называюць «вішнёвай сталіцай», бо кожны год там ладзіцца «ягаднае» свята. На першы погляд можа падацца, што гэтыя фестывалі жартоўныя. Але калі капнуць трошку глыбей, атрымаецца, што асабістае для кожнага рэгіёна свята — гэта не толькі своеасаблівы брэнд, але і працяг старажытных традыцый. Вядома ж, у сучасным выглядзе.

Сустрэча, прысвечаная рэгіянальным святам, адбылася днямі ў прэс-цэнтры БелТА. Спікеры распавялі аб фестывалях Беларусі і анансавалі правядзенне новых мерапрыемстваў.

— Сёння рэспубліканскія і рэгіянальныя фестывалі — важны аспект у развіцці народнай мастацкай творчасці, — адзначыла **Вольга АНТОНЕНКА, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур.** — Менавіта яны дазваляюць не толькі захаваць, але і зрабіць больш папулярнымі народныя традыцыі. Асноўным органам, які каардынуе правядзенне такіх свят, з'яўляецца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Была наступная мэта: беларускі рэгіён павінен прагучаць на міжнароднай арэне. Высветлілася, што ў такім выпадку ён павінен мець уласны брэнд. І дзесяць гадоў таму мы пачалі працаваць над тым, каб стварыць брэнд амаль для кожнага рэгіёна. То-бок сталі развіваць фестывальны рух, дзякуючы чаму развіўся і культурны турызм. У мінулым годзе мы зрабілі спіс рэгіянальных культурных брэндаў Рэспублікі Беларусь, які ўключае ў сябе 209 розных свят і конкурсаў. Не без гонару адзначу, што летась Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур выдаў кнігу «Фестывалі ад А да Я»: у яе ўвайшлі найбольш знакавыя мерапрыемствы.

Вольга Антоненка дадала, што 11 верасня ў Верхнім горадзе адбудзецца ўрачыстае адкрыццё фестывалю культур. Удзел у адкрыцці прымуць прадстаўнікі 25 нацыянальнасцяў.

Арына КАРПОВІЧ.

ЦІКАВА

✓ **Штогод у рэгіёнах Беларусі праводзіцца больш за 50 розных фестываляў і свят.**

✓ **У гэтым годзе фестываль гістарычнай рэканструкцыі ў Нясвіжы, які адбыўся падчас Ночы музеяў, наведала каля 30 тысяч чалавек.**

✓ **У Беразіне ладзіцца свята-конкурс старажытных рамёстваў «Бярэзінскія лыжкары». У гонар гэтага ў горадзе ўсталявана самая вялікая драўляная лыжка ў свеце. Яе даўжыня складае каля 24 метраў.**

Далучайцеся!

ПАНЯМОННЯ ЖЫВАТВОРНЫЯ КРЫНІЦЫ

Шчучын запрашае на фэст

Абласны фестываль рэгіянальнага фальклору «Панямоння жывацворныя крыніцы» — адзін з самых яскравых і каларытных фэстаў на Гродзеншчыне, які за амаль 15 гадоў не страціў сваёй актуальнасці. 4 верасня ў Шчучыне збяруцца найлепшыя транслятары фальклорнага мастацтва і самыя таленавітыя майстры народнай творчасці, каб падчас самабытнай культурнай падзеі паказаць гасцям найлепшае з таго, што засталося нам ад продкаў.

Традыцыйна фестываль ахоплівае ўсю Гродзенскую вобласць і прадстаўляе дасягненні культуры кожнай, нават самай маленечкай, вёсачкі. З красавіка да чэрвеня ў Гродзенскім, Ваўкавыскім, Лідскім, Смаргонскім і Навагрудскім раёнах праходзілі занальныя аглядды-конкурсы абласнога фестывалю, дзе вызначаліся найлепшыя фальклорныя творцы.

Заключныя фестывальныя мерапрыемствы ў Шчучыне падораць гледачам выступленні фальклорных калектываў і выканаўцаў вобласці, гульнёва-забаўляльныя праграмы і майстар-класы па навучанні бытавым танцам. А на выстаўцы-кірмашы майстры народнай творчасці прадэманструюць тэхналагічны працэс традыцыйных рамёстваў і дадуць магчымасць гасцям паўдзельнічаць у ім. Самым яскравым эпізодам фестывалю стане канцэрт з удзелам найлепшых фальклорных калектываў Гродзеншчыны.

Андрэй ПЯТРУК,
вядучы метадыст Гродзенскага АМЦНТ.

ІСПЫТ НА ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ

Палігон не для грыбнікоў

Трапіць на Абуз-Лясноўскі паліго, як яшчэ яго называюць, без спецыяльнага дазволу немагчыма. І гэта не толькі звязана з тым, што неўзабаве тут адбудуцца вучэнні. Па-першае, гэта небяспечна. Але некаторыя мясцовыя жыхары, якія ведаюць тут усе сцежкі, усё ж умудраюцца сюды пранікнуць. Грыбны ж сезон, а на палігоне, як вядома, грыбоў хоць вазамі вазі!

Вядома, такіх гасцей прадстаўнікі ваеннай камендатуры выяўляюць хутка. У асноўным людзі адэкватна ўспрымаюць просьбы вайскоўцаў пакінуць тэрыторыю палігона. Некаторыя ж з году ў год не могуць зразумець, чым для іх можа скончыцца збор грыбоў.

— Знаходжанне на палігоне старонніх людзей небяспечна як падчас стрэльбішчаў, так і пасля: ніхто не выключае, што тут могуць застацца неразарваныя снарады, — тлумачыць **начальнік штаба 1-га зводнага атрада забеспячэння правапарадку старшы лейтэнант Юрый ЯРМАЛІНСКІ.** — Каб на тэрыторыі палігона не было выпадковых людзей, мы рэгулярна прачэсваем мясцовасць. Увогуле, напярэдадні і падчас манеўраў мы адказваем за правапарадак і вайсковую дысцыпліну. Акрамя таго, у нашай кампетэнцыі — не дапусціць правакацыйных дзеянняў на тэрыторыі палігона, а ў выпадку іх выяўлення — спыніць. Нясём службу сумесна з ваеннай паліцыяй Узброеных Сіл Расійскай

Ніхто не трапіць на палігон незаўважаным.

прыбыў загадзя: Райду патрэбен час на адаптацыю. Дарэчы, дарогу, хоць ехалі яны нядоўга, сабака вытрымаў паспяхова: на цягніках едзе не ўпершыню. Былі ў нямецкай аўчаркі падарожжы і на больш працяглыя адлегласці.

Галодны салдат — дрэнны салдат

Вайскоўцы 105-га асобнага механізаванага батальёна 11-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады на палігон прыбылі ў канцы ліпеня. Палявы лагер абсталявалі за адзін дзень. Цяпер тут усё прыдатна для жыцця. Палаткі, у якіх жывуць вайскоўцы, унутры поўнасцю падобныя да казармаў. І цёпла ў іх як дома. Абсталяваны месцы для ўмывання, прыёму ежы, адпачынку. Безумоўна, ёсць тут і кухня: як кажуць, галодны салдат — дрэнны салдат.

У кінолагаў падчас вучэння — свае задачы.

Федэрацыі, з якой ажыццяўляем і кантроль за эксплуатацыяй транспартных сродкаў, і суправаджэнне воінскіх калон. Сумесна з ваеннай аўтамабільнай інспекцыяй вядзём патрулі на дарогах агульнага карыстання на тэрыторыі палігона.

А вось калі хтосьці з грыбнікоў усё ж такі заблукаў, на дапамогу разам са сваімі чатырохногімі гадаванцамі прыйдуць кінолагі. Працуюць яны і на кантрольна-прапускных пастах: сабакі хутчэй, чым людзі, могуць папярэдзіць незаконны ўвоз і вываз выбуховых рэчываў.

Выкладчык курса па патрульнай і вартавой службе кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл Беларусі Віталь Скурат у вучэннях будзе ўдзельнічаць разам са сваім верным сябрам па мянушцы Райд. І калі для старшага лейтэнанта гэта другія маштабныя вучэнні, то на ліку вопытнай нямецкай аўчаркі іх значна больш. Жывёла выдатна спраўляецца з аховай аб'ектаў, хутка знаходзіць чалавека па следзе, а калі патрэбна, затрымае і правапарушальніка. Са сваім гадаванцам на палігон ваеннаслужачы

У палявых умовах ежа для вайскоўцаў гатуецца ў аўтамабілі ПАК-200. Адначасова ў ім можна гатаваць тры стравы. Звычайна ў вялікіх катлах вараць суп, кашу з мясам, кампот або чай. За адзін раз такая машына можа накарміць 200 чалавек. Калі ж неабходнасць у колькасці порцый павялічваецца, то гатуецца ежа і ў кухні прычапной-130, якая, адпаведна, разлічана на 130 чалавек. Дарэчы, гарачым харчаваннем вайскоўцы забяспечваюцца нават тады, калі ПАК-200 на хаду.

Калі мы прыбылі ў палявы лагер, тут ва ўсю гатаваўся абед. Каб і не ведаў, дзе размешчана кухня, то пах выдае адно з любімых месцаў вайскоўцаў. Сёння яны будуць абедаць гарохавым супам, рысавай кашай з мясам, не абыдзецца і без кампоту. Як падзяліўся **камандзір гаспадарчага аддзялення ўзвода матэрыяльнага забеспячэння старшына Дзмітрый ЛАГОША,** вада ў палявой кухні закіпае за гадзіну. «Час прыгатавання стравы залежыць ад таго, што мы гатуем, — гаворыць галоўны па кухні. — Рыс, напрыклад, у палявых умовах варыцца 20 хвілін, грэчка — 25. Суп, калі мы робім яго з канцэнтрату, увогуле будзе гатовы праз 10 хвілін пасля закіпання вады. Адным словам, не нашмат даўжэй, чым на звычайнай пліце».

Харчуюцца вайскоўцы на палігоне, як і ў вайсковай часці, тройчы на дзень. Стравы тут заўсёды свежыя, гарачыя. «Падсалоджваецца» салдацкае жыццё цукеркамі і пячэннем. Толькі традыцыйнай раздачы няма. У кожнага вайскоўца — свой кацялок, які напаўняецца ежай, ужыць якую ён можа тады, калі захочацца.

Як прызнаецца Міхаіл Сінкавец, кормяць вельмі добра. «Можа, проста есці на свежым паветры смачней, — мяркуе салдат тэрміновай службы. — Харчаванне разнастайнае, усяго хапае. Увогуле, менавіта на палігоне можна адчуць сапраўднае армейскае жыццё».

Спартыўны дух і палявы «амфітэатр»

Вайскоўцы 105-га асобнага механізаванага батальёна рыхтуюць да вучэння вучэбна-матэрыяльную базу палігона. Амаль кожны з іх ужо ўдзельнічаў у падобных манеўрах. Таму задачы тут двойчы не паўтараюцца.

Начальнік штаба — першы намеснік камандзіра вайсковай часці 11525 маёр Аляксандр АНТОНЧЫК у вучэннях, у тым ліку «Захад», прымае ўдзел з 2009 года. Таму навічкам яму ёсць што расказаць, а каму патрэбна якая-небудзь парада — ніколі не адмовіць. «Для кожнага салдата ўдзел у вучэнні — нагода для гонару, — перакананы афіцэр. — І не толькі таму, што вайскоўцы ўдасканальваюць сваю баявую падрыхтоўку, вучацца прымаць рашэнні ва ўмовах бою. Менавіта тут, на палігоне, адбываецца абмен вопытам: як у складзе сваіх падраздзяленняў, так і з суседзямі».

Трэба адзначыць, што ўзаемадзеянне з нашым стратэгічным партнёрам наладжваецца яшчэ да пачатку манеўраў. У вольны час вайскоўцы з Беларусі і Расіі разам наведваюць канцэрты, якія ладзяць для іх беларускія артысты, спаборнічаюць у спартыўных мерапрыемствах. Днямі, напрыклад, разыгрываліся чатыры кубкі. Зводныя каманды з беларускіх і расійскіх вайскоўцаў змагаліся паміж сабой у перацягванні каната, падыманні гіры, падцягваліся, гулялі ў футбол. Прадстаўнікам 105-га асобнага механізаванага батальёна, напрыклад, не было роўных у падыманні гіры.

Наўрад ці хто складзе ім канкурэнцыю і ў інфармаванні. Як толькі ў вайскоўцаў батальёна вольная часіна, многія з іх ідуць у пакой вольнага часу і інфармавання, які таксама абсталяваны ў лагеры. Дзякуючы друкаваным выданням (адметна, што чытаюць тут і «Звязду» — падшыўка нашай газеты ляжыць на самым бачным месцы) маладыя людзі нават у палявых умовах у курсе апошніх навін.

Акрамя імправізаванай бібліятэкі, ёсць на тэрыторыі палявога лагера і свой «амфітэатр». Тут праводзяцца не толькі сходы асабовага складу. Дзякуючы мабільнаму і шматфункцыянальнаму партатыўна-інфармацыйнаму комплексу ў вячэрні час у імправізаваным «амфітэатры» вайскоўцы слухаюць радыё, глядзяць кінафільмы і тэлеперадачы. І гэта нягледзячы на тое, што ў кожнай палатцы ёсць тэлевізар.

Хлеб для вайскоўцаў пякуць адразу на палігоне.

Сувязь — нерв арміі

Вучэнне — гэта не толькі праверка магчымасцяў вайсковых падраздзяленняў, прафесійнага майстэрства кожнага салдата і афіцэра. Падчас падобных манеўраў ацэньваецца і ўзаемадзеянне — як унутры арміі, так і паміж Узброенымі Сіламі дзяржаў. Калі зладжана дзейнічаюць усе воінскія падраздзяленні, гэта абавязкова гарантуе поспех як у баявой сітуацыі, так і падчас мірнага жыцця. Невыпадкова ў такіх маштабных манеўрах задзейнічаны прадстаўнікі амаль усіх воінскіх прафесій. Для большасці з іх гэта ўжо не першы іспыт на прафпрыдатнасць.

Начальніку сувязі — начальніку аддзела сувязі штаба Заходняга аператыўнага камандавання Станіславу ЗАХАРЭЎСКАМУ сёння складана падлічыць, якім па ліку будзе для яго вучэнне «Захад-2021». За 19 гадоў службы ў войску ў падпалкоўніка іх было нямала, але, нягледзячы на вопыт, падрыхтоўка да кожнага вучэння ў афіцэра і яго падначаленых вельмі сур'ёзная.

— Задача асабовага складу падчас маючых адбыцца манеўраў — падрыхтаваць і забяспечыць функцыянаванне вузлоў сувязі пунктаў кіравання ў інтарэсах Заходняга аператыўнага камандавання, — адзначыў Станіслаў Захарэўскі. — Мы павінны зрабіць усё дзеля таго, каб сістэма сувязі функцыянавала ўстойліва і бесперапынна. Сувязь — нерв арміі, без яе няма Перамогі. Падчас вучэння «Захад-2021» мы прадэманструем тыя навыкі і ўменні, якія спецыялісты сувязі, а таксама кожны ваеннаслужачы Узброеных Сіл за гэты навучальны год дасягнулі падчас праходжання або тэрміновай службы, або службы па кантракце.

Салдаты рыхтуюць тэхніку.

Хлеб — усяму галава

Між іншым, што падчас беларуска-расійскіх вучэнняў вайскоўцы будуць есці хлеб уласнай вытворчасці. Яшчэ цёплымі духмяныя боханы будуць дастаўляцца ў кожнае вайсковае падраздзяленне.

Механізаваны палявы хлебазавод на палігоне ўжо разгорнуты. Больш за тое — ужо цяпер там пякуць хлеб, водар якога напаўняе ўсю прастору. Як расказаў **намеснік начальніка харчовай базы 3540 — начальнік ўліковага-аперацыйнага аддзела падпалкоўнік Аляксандр ГЛАДКІХ,** за суткі ў хлебапечцы перасоўнага хлебазавода выпякаецца да 6 тон хлеба, якім можна накарміць каля 14,5 тысячы чалавек. Дарэчы, хлеб вельмі смачны (журналістаў, вядома, пачаставалі). Хоць рэцэпт звычайны, прыдуманы яшчэ ў савецкі час: мука пшанічная першага гатунку, соль, дрожджы, цытрынавая кіслата і вада.

— Каб атрымаўся такі бохан хлеба (а гэта ні многа, ні мала 1,2 кілаграма. — **Аўт.**), ад моманту замешвання цеста да выманя яго з печкі неабходна ў сярэднім шэсць гадзін, — удакладняе **начальнік хлебазавода 120-й асобнай механізаванай брыгады старшы лейтэнант Дзмітрый РАБЦЭВІЧ.** — Згодна з нормамі, яшчэ столькі ж ён павінен астываць. Гэта камандная работа. Аднаму спячы хлеб у такіх маштабах немагчыма. Увогуле, гэта як і ў любой справе: каб атрымаўся смачны хлеб, патрэбна ўкласці ў працэс прыгатавання душу.

Спадзяёмся, гэты хлеб будзе даваць сілы нашым вайскоўцам, якія абавязкова прадэманструюць падчас вучэння ўсю магутнасць і баяздольнасць беларускай арміі.

Фота Аліны МАЗАВЕЦ.

Баранавіцкі раён.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Баявая загартоўка

АЛІМПІЯДА Ў ПАГОНАХ

Беларускія ваеннаслужачыя змагаюцца за медалі ў VII Армейскіх міжнародных гульнях

Ужо сёмы год запар магчымасці сваіх нацыянальных армій дэманструюць вайскоўцы з розных краін свету. Па колькасці ўдзельнікаў гэтыя Армейскія гульні сталі самымі маштабнымі ў гісторыі: сёлета за званне найлепшых змагаецца больш чым 270 каманд з 42 краін свету. Беларусы прэтэндуюць на ўзнагароды ў 27 з 34 конкурсаў — дагэтуль нашы вайскоўцы ўдзельнічалі ў меншай колькасці спаборніцтваў. У адным з найбольш відовішчных — танкавым біятлоне — традыцыйна прымаюць удзел і нашы танкісты.

Беларусы сталі сярэбранымі прызёрамі ў конкурсе «Дарожны патруль».

Конкурсная геаграфія — 11 краін

VII Армейскія міжнародныя гульні пачаліся 22 жніўня і працягнуцца да 4 верасня. Сёлета на палігонах Беларусі, Расіі, Казахстана, Кітая, Арменіі, а таксама іншых краін (спаборніцтвы праходзяць на тэрыторыі 11 дзяржаў) за медалі змагаюцца танкісты, лётчыкі, дэсантнікі, артылерысты, сапёры, снайперы, кінолагі, кухары і іншыя армейскія спецыялісты.

На беларускай зямлі вайскоўцы спаборнічаюць у конкурсах «Палярная зорка», «Снайперскі рубеж» і «Упэўнены прыём». Наша краіна ўпершыню прымае на сваёй тэрыторыі ваеннаслужачых з Лаоса, Малі і Саудаўскай Аравіі — у Беларусь прыехала звыш 400 вайскоўцаў з 17 краін. Сваё майстэрства дэманструюць снайперы, падраздзяленні спецназа і сувязісты.

Сёлетнія Армейскія гульні адметныя яшчэ і тым, што ў іх уключаны новыя спаборніцтвы: «Мерыдыян» (конкурс спецыялістаў ваенна-тапаграфічнай службы), «Тактычны стралок» (практыкаванне з элементамі армейскай тактычнай стральбы), «Армія культуры» (першынства творчых калектываў).

Высокая планка

За гады існавання вайсковай алімпіяды, як называюць армейскія гульні, беларускія вайскоўцы паказвалі добрыя вынікі. Нашы ваеннаслужачыя спаборнічаюць у іх з моманту стварэння.

— Калі ў самыя першыя гады ў іх удзельнічалі ўсяго толькі пяць краін, то сёння геаграфія ўдзельнікаў армейскіх гульняў закранае, можна смела сказаць, трэцюю частку армій свету, — заявіў падчас провадаў беларускай каманды на Армейскія міжнародныя гульні **міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Віктар ХРЭНІН.** — Гэта сведчыць аб узрослым узроўні падрыхтоўкі. Нашы ваеннаслужачыя нароўні змагаюцца з вайскоўцамі такіх армій-гігантаў, як Кітай, Расійская Федэрацыя, Іран і паказваюць годныя вынікі. Летась мы занялі другое агульнакаманднае месца. І такі вынік — гэта высока ўзнятая планка. І сёння, размаўляючы з нашымі хлопцамі, я бачу, што ў іх добры маральны дух і яны настроены ўтрымліваць і, магчыма, нават павысіць свае вынікі ў конкурсах, якія праводзяцца.

У адным з найбольш відовішчных конкурсаў — «Танкавы біятлон» — нашы вайскоўцы застаюцца аднымі з лідараў.

Перад тым як выступіць на міжнароднай арэне, вайскоўцы скрупулёзна трэніруюцца ў сябе на Радзіме. Але перш чым трапіць у нацыянальную каманду, трэба прайсці конкурснае выпрабаванне ўнутры свайго воінскага злучэння, на ўзроўні камандавання і толькі потым на рэспубліцы. Такі падыход дазваляе адабраць найлепшых спецыялістаў, якія могуць прадэманстраваць добры ўзровень падрыхтоўкі.

— Беларусь — адна з нешматлікіх краін, дзе ў склад зводных каманд уваходзяць ваеннаслужачыя тэрміновай службы, — падкрэсліў кіраўнік абароннага ведамства нашай дзяржавы. — Гэта паказвае высокі ўзровень падрыхтоўкі нашых хлопцаў. Сёння Армейскія міжнародныя гульні сталі ўжо аўтарытэтнай пляцоўкай у правядзенні падобных конкурсаў. У нас ужо ёсць першы вынік — гэта тое, што працэс падрыхтоўкі да гульняў інтэграваны ў працэс баявой падрыхтоўкі і стаў яе неад'емнай часткай. Ваеннаслужачыя добра засвоілі праграму, прайшлі жорскі адбор, выйшлі ў склад нацыянальнай каманды і паказваюць добрыя вынікі. У нас, без сумневу, сур'ёзныя канкурэнты, але і нам ёсць што паказаць.

Нашы ваеннаслужачыя радуюцца кожнаму поспеху ў Армейскіх гульнях.

Як адзначыў **галоўны суддзя конкурсу «Сувораускі націск» генерал-маёр Цаа ХЭСЯНЬ,** правядзенне цяперашніх Армейскіх міжнародных гульняў з'яўляецца не толькі важным складнікам ваеннага абмену паміж краінамі-ўдзельніцамі, але і каштоўным шанцам для паглыблення кітайска-беларускага ваеннага дзелавога супрацоўніцтва, дэманстрацыі духоўнага аблічча краін-удзельніц, узмацнення ўзаемнага даверу народаў абедзвюх краін і абмену ваеннымі навыкамі.

У КНР, дарэчы, беларусы прымаюць удзел у конкурсах «Сувораускі націск», «Чыстае неба» і «Бяспечнае асяроддзе». Сапернікамі для нашых каманд з'яўляюцца вайскоўцы з Венесуэлы, В'етнама, Егіпта, Кітая, Расіі і Узбекістана.

Беларускія вайскоўцы заваявалі «серабро» ў конкурсе «Дарожны патруль», які праводзіўся ў Катары

На заключным этапе спаборніцтва — «замена кола» — старшы прапаршчык Юрый Скляранка і прапаршчык Аляксандр Пісарчык не пакінулі сапернікам ніякіх шанцаў і ўпэўнена сталі лідарамі ў гэтым практыкаванні. Па выніках усіх этапаў конкурсу беларуская каманда заняла другое месца, саступіўшы ўсяго адзін бал расіянам. «Бронза» — у вайскоўцаў з Узбекістана.

На авансцэне — танкісты

Традыцыйна самым маштабным і відовішчным спаборніцтвам гульняў з'яўляецца «Танкавы біятлон». Беларускія ваеннаслужачыя каторы год не ўпускаюць магчымасці паказаць узровень сваёй прафесійнай падрыхтоўкі, майстэрства і зладжанасці экіпажаў. І кожны раз яны на вышыні.

Нашы танкісты ўжо ажыццявілі свой першы заезд на этапе «Індывідуальная гонка», у выніку якога апынуліся на фінішы трэцімі, саступіўшы першынства танкістам з Казахстана і Азербайджана.

— Саступілі нязначна, каля 40 секунд, — пракаментаваў першае выступленне каманды **кіраўнік беларускай дэлігацыі — суддзя конкурсу «Танкавы біятлон» генерал-маёр Андрэй НЕКРАШЭВІЧ.** — Для хлопцаў, якія ўпершыню ўдзельнічалі ў «Танкавым біятлоне», гэта дастаткова годны вынік. Важна разумець, што нашы танкісты спаборнічалі з экіпажамі, якія ў гэтым конкурсе выступаюць на працягу трох-чатырох апошніх гадоў. Танкісты адчулі, што гэта такое і ў далейшым не будуць рабіць памылак. Галоўныя гонкі ў нас яшчэ наперадзе, і асноўны ўпор мы зробім на ўдзеле ў эстафеце.

У другім заездзе індывідуальнай гонкі нашы танкісты сталі першымі. Трэці заезд з удзелам беларусаў адбудзецца заўтра. Фінал «Танкавага біятлона» чакаецца 4 верасня. Спадзяёмся, што сярод фіналістаў мы ўбачым і беларусаў.

Фота «Ваяр».

Гонар

НА МАГІСТРАЛІ — САМАЛЁТЫ

Беларускія і расійскія лётчыкі ажыццявілі пасадку на аэрадромны ўчастак дарогі

За палётамі авіяцыі маглі днямі назіраць усе тыя, хто вымушаны быў аб'язджаць пэўны ўчастак аўтатрасы Мінск — Магілёў. Прычым пілоты не толькі ляталі над дарогай, але і прызямляліся на яе — лётчыкі адпрацоўвалі пасадку на аэрадромны ўчастак дарогі. Сапраўдныя прафесіяналы павінны ўмець не толькі кіраваць сваімі вінтакрылымі машынамі ў любых умовах. У іх кампетэнцыі — яшчэ і пасадзіць іх там, дзе, здавалася б, гэта зусім немагчыма.

Аднак непасільных задач для нашых авіятараў не бывае. Гэта яны яшчэ раз даказалі падчас сумеснага спецыяльнага вучэння з сіламі і сродкамі тэхнічнага і тылавога забеспячэння Узброеных Сіл Беларусі і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі, якое гэтымі днямі праходзіць на тэрыторыі нашай краіны.

Пасадка ваенных самалётаў на аэрадромны ўчастак дарогі з'яўляецца адным з самых складаных элементаў у авіяцыі. Нягледзячы на гэта, падобныя задачы, пачынаючы з 2007 года, адпрацоўваюцца Ваенна-паветранымі сіламі нашай краіны штогод. Аб высокай якасці беларускай ваеннай лётнай школы сведчыць хаця б той факт, што ў 2016 годзе нашы пілоты ўпершыню на постсавецкай прасторы ноччу пасадзілі на дарогу штурмавік Су-25. А ў мінулым годзе пасадку на аэрадромны ўчастак дарогі нароўні з вопытнымі пілотамі ўпершыню здзейсніў курсант Ваеннай акадэміі. Сёлета іншыя курсанты паўтарылі гэты вопыт.

Самалёты Су-25, Як-130 і Л-39 паспяхова прызямліліся на аўтатрасу Мінск — Магілёў. Гэта, безумоўна, вышэйшы пілатаж. Толькі лётчыкі — народ сціплы. Шырыня дарогі, на якую ажыццяўлялася пасадка, у два, а то і ў тры разы вузейшая, чым узлётна-пасадачная паласа на звычайным аэрадроме. Акрамя таго, прызямляліся лётчыкі, лічы, на вока — адсутнасць радыётэхнічных сродкаў і сродкаў навігацыі, якімі абсталяваны аэрадром, безумоўна, ускладняе задачу. Пасадзіць шматтонную машыну на вузкую палоску сярод лесу (а менавіта так з вышыні выглядае дарога) здольныя сапраўдныя прафесіяналы.

Лётчыкаў павіншаваў міністр абароны. Беларускія пілоты атрымалі ад Віктара Хрэніна каштоўныя падарункі.

Фота «Ваяр».

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.

У цэнтры ўвагі

Сяргей РАЧКОЎ:

«НЕ ВЫКЛЮЧАНА ВЯРТАННЕ ЗША Ў АФГАНІСТАН ПАСЛЯ ПЭЎНАЙ ПАЎЗЫ»

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ падзяліўся з карэспандэнтам «Звязды» сваім бачаннем сітуацыі, якая склалася сёння ў Афганістане, і прагнозам развіцця падзей у гэтай краіне на перспектыву.

— Сяргей Анатольевіч, наколькі змена свецкай улады ў Афганістане на рэлігійна-радыкальную можа ўплываць на наш, беларускі, парадак дня?

— Ведаеце, здаецца краіна геаграфічна знаходзіцца далёка ад Беларусі, але толькі геаграфічна.

Па-першае, мы звязаны з ёй тым, што ў нас значная частка беларусаў 10 гадоў служыла ў складзе абмежаванага кантынгенту войск у Афганістане. Мы, як і шэраг краін Савецкага Саюза, панеслі страты: загінулі нашы маладыя хлопцы і мы памятаем аб іх — штогод на Востраве мужнасці і смутку ўскладаем вянкі, кветкі, праводзім жалобны мітынг у памяць аб тых, хто загінуў, і аб тых, хто сумленна аддаў свой доўг. Таму існуе маральна-духоўная, гістарычная сувязь.

Другі момант. Мы з'яўляемся актыўным членам АДКБ і мы не можам (нягледзячы на тое, што ў нашай Канстытуцыі закладзены тэзіс аб нейтралітэце Рэспублікі Беларусь) накіроўваць свае Узброеныя Сілы за межы нашай краіны. Але, тым не менш, у нас ёсць пэўныя абавязацельствы перад краінамі — членамі гэтага ваенна-палітычнага саюза. Таму недарэмна Прэзідэнт паставіў пытанне аб тым, што на пазачарговай сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ неабходна вызначыцца з пазіцыяй гэтай структуры па сітуацыі ў Афганістане. Гэта сведчыць аб тым, што на самай справе сітуацыя можа сур'ёзна паўплываць не толькі на краіны, якія мяжуць з Афганістанам — Таджыкістан, Узбекістан, Туркменістан, — але і на Рэспубліку Беларусь і Расійскую Федэрацыю. Бо калі падзеі будуць развівацца па сцэнарыі, што ў Афганістане будзе ўводзіцца шарыят, будзе жорсткае абыходжанне з грамадзянамі, працягваць рэзкае падзенне эканамічных умоў жыцця (а гэта рэальнасць, і не выключана, што ў хуткім часе там можа быць голад) — уцёкі людзей з гэтай краіны будуць аб'ектыўна абгрунтаваны, і яны пойдуць на Захад, у тым ліку праз Расію і Беларусь. І тады мы сутыкнёмся з сур'ёзнай праблемай афганскіх бежанцаў. Дарэчы, ужо цяпер на польскай граніцы вымалёўваецца пэўная неспрыяльная сітуацыя.

І трэці аспект. Ці спыніцца Талібан і разам з ім спячыя ячэйкі Ісіл, якія існуюць у гэтай краіне і тэарэтычна «спяць» і ў суседніх дзяржавах? То-бок гэта пытанне схаванай тэрарыстычнай пагрозы.

Таму мы павінны ўспрымаць гэтую сітуацыю не толькі праз прызму ганьбы і правалу палітыкі ЗША і НАТА ў гэтай краіне. Хоць гэта добры ўрок для многіх краін, якія імкнуцца арганізаваць сваё жыццё праз знешняе кіраванне. Мы ў нашай краіне не дапусцім, каб было арганізавана знешняе кіраванне.

Аднак схаваная тэрарыстычная пагроза існуе, і мы павінны да яе быць вельмі ўважлівыя. Вядома, любой пагрозе, калі яна перарасце са схаванай у адкрытую і гарачую форму, мы будзем супрацьдзейнічаць. Але будзем рабіць гэта на сваёй тэрыторыі.

— Вы закранулі тэму палітыкі ЗША і ганебных уцёкаў з Афганістана. Відавочна, што Злучаныя Штаты панеслі каласальную паразу менавіта ў гэтым рэгіёне. А як вы лічыце, ці будзе спроба рэваншу?

— Афганістан мае важнае геастратэгічнае становішча. Чаму Савецкі Саюз увёў туды ў 1979 годзе абмежаваны кантынгент савецкіх войск? Таму што была пагроза ўстаноўкі з боку ЗША балістычнай ракеты «Першынг», якая закранала б тэрыторыю СССР, існавала такая версія.

Акрамя таго, краіна багатая на мінеральныя рэсурсы: па ацэнках, якія рабілі геолагі Савецкага Саюза, а потым прадстаўнікі Злучаных Штатаў Амерыкі, мінеральных рэсурсаў у Афганістане на трыльёны долараў: золата, жалезная руда, ліцій, рэдказямельныя металы. Прагноз такі, што па запасах ліцію краіна можа пераўзысці запасы Балівіі (якая цяпер лідзіруе па разведаных запасах). Але тут ёсць складанасць — гэта найскладанейшыя праекты, і ўсе гэтыя мінеральныя рэсурсы знаходзяцца ў цяжка дасягальных месцах, таму патрабуюцца вялікія інвестыцыі для таго, каб іх здабываць. Але, тым не менш (зноў жа, па адпаведных паведамленнях), талібы штогод мелі з паставак золата і шэрагу мінеральных рэсурсаў да 400 мільёнаў долараў.

Зараз усе звярнулі ўвагу на пазіцыю Кітая і Расійскай Федэрацыі ў адносінах да змены ўлады ў Кабуле — яна нейтральна-станоўчая, нягледзячы на тое, што Талібан прызнаны ў Расійскай Федэрацыі тэрарыстычнай арганізацыяй. Мы, дарэчы, у Беларусі не давалі ніякіх ацэнак, не ўключалі ні ў якія спісы, дэманструючы тым самым, што гэтая краіна далёка ад нас.

А як павядзе сябе ЗША ў далейшым? Мяркую, што Злучаныя Штаты Амерыкі ўсё роўна будуць працягваць уважліва сачыць за сітуацыяй у Афганістане. Я ўпэўнены, што там захаваюцца іх дарадцы (ваенныя дарадцы ў тым ліку), і ў патрэбны момант, калі ў гэтай краіне вельмі заўзята павядуць Кітай і Расійская Федэрацыя, пасля пэўнай паўзы не выключана актыўнае вяртанне ЗША.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Меркаванне

«АДЗІНСТВА — ГЭТА МАСА ПАНЯЦЦЯЎ, ЯКІЯ ЦЭННЫЯ ДЛЯ НАС, БЕЛАРУСАЎ»

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Жанна ЧАРНЯЎСКАЯ:

— Падчас «Вялікай размовы» выразна акрэслілася пазіцыя нашай дзяржавы і ўсіх актыўных людзей — не баяцца і не саромецца нікога. Мы ўбачылі, наколькі блёкла выглядалі брытана-амерыканскія журналісты, якія проста паўтаралі адны і тыя ж фразы, адно і тое ж пытанне, сёння ўжо практычна не актуальнае.

Сёння мы думаем пра тое, як працягваць жыць далей у новых умовах. Натуральна, цяперашняя сітуацыя — сігнал для ўсіх структур і ўстаноў, што працаваць як раней нельга — неабходна шукаць новыя напрамкі работы. Самая важная тэма, якая гучала на працягу ўсёй «Вялікай размовы з Прэзідэнтам» — тэма яднання. Важна разумець, што такое адзінства. Асабіста я ўкладаю ў гэтае паняцце вельмі шмат сэнсаў, якія можна сабраць у адзін пасыл: яднанне народа, дзяржавы і людзей, гэта мір, дабро, прыняцце, міласэрднасць... — маса паняццяў, якія аб'ядноўваюць нас, беларусаў.

І мы не проста так у 2020 годзе ўсе разам, узначаленыя кіраўніком дзяржавы, супрацьстаялі і змаглі вытрымаць гэты націск. Вытрымліваем дагэтуль! Таму што санкцыі, якія да нас прад'яўляюць, эканамічна нас душаць, увогуле прымушаюць рухацца па-іншаму, займацца ўнутраным развіццём. Гэта свайго роду штуршок да далейшага развіцця Рэспублікі Беларусь. Гэта тое, што дапаможа нам у будучыні стаць яшчэ мацнейшымі.

Тэмы, узнятыя падчас «Вялікай размовы», і пытанні, якія ставіць перад намі дзень сённяшні, абмяркоўваюцца падчас рэгіянальных форумаў «Беларусь адзіная». Падобныя сустрэчы вельмі важныя, таму што ўсе, хто жыве і працуе ў рэгіёнах, пачуюць меркаванні экспертаў, якія агучваюць самыя вострыя пытанні, наўпрост працавалі з кіраўніком дзяржавы, у тым ліку і ў складзе канстытуцыйнай камісіі. Такія сустрэчы дапамагаюць зразумець, як далей працаваць, куды рухацца, што адбываецца ў грамадстве, як спрыяць аб'яднанню, а не раз'яднанню народа.

У гэтым выпадку хочацца ўспомніць прынцып Гая Юлія Цэзара, які нарадзіўся ў 100 годзе да нашай эры і казаў: раз'ядноўвай і ўладар. А Гётэ даказаў, што самы лепшы падыход — аб'ядноўвай і накіроўвай. І, на маю думку, Прэзідэнт і наш урад працуюць менавіта ў гэтым кірунку: аб'ядноўваюць і накіроўваюць развіццё нашай краіны.

Запісала Наталля КАПРЫЛЕНКА.

17 верасня. Дзень, які варта адзначаць

Нашых братоў у бядзе не пакінулі...

Жыхары Заходняй Беларусі сустракалі воінаў Чырвонай Арміі як сваіх збаўцаў ад польскага прыгнёту

1 верасня 1939 года нямецкія войскі ўварваліся на тэрыторыю Польшчы — пачалася Другая сусветная вайна. Рэакцыйны польскі ўрад не здолеў арганізаваць абарону краіны і быў не ў сілах супрацьстаяць нямецкай ваеннай машыне. Гітлераўскія дывізіі набліжаліся да тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, і савецкаму ўраду неабходна было прыняць неадкладныя меры па забеспячэнні сваёй бяспекі і вырашыць лёсы мільёнаў беларусаў і ўкраінцаў.

Было дадзена распараджэнне галоўнаму камандаванню Чырвонай Арміі ўзяць пад абарону жыццё і маёмасць насельніцтва ўсіх украінскіх і беларускіх грамадзян, аб неабходнасці тактоўнага і лаяльнага стаўлення да польскага насельніцтва, польскіх дзяржаўных чыноўнікаў і вайскоўцаў, якія не аказваюць збройнага супраціву. З атрыманнем загаду аб пераходзе граніцы ва ўсіх частках фронту былі праведзены мітынгі і кароткія сходы, на якіх байцы і камандзіры абавязаліся з гонарам выканаць пастаўленыя перад імі баявыя задачы. Воінам перад строем быў зачытаны зварот да байцоў і камандзіраў Беларускага фронту, у якім адзначалася: «Распушчанае панства адняло ў працоўных Заходняй Беларусі ўсё: зямлю, палітую іх потам і крывёю, хлеб, здабыты непасільнай працай... Вы вяртаеце да жыцця гэтых людзей, родных і любімых нашых братоў, за лёс якіх так балела наша сэрца».

17 верасня 1939 года ў 5 гадзін 40 хвілін войскі перайшлі савецка-польскую граніцу і пачалі вызваленчы паход. Камандаванне Беларускага фронту звярнулася з заклікам да салдат, працоўных Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Польшчы, у якім гаварылася: «Чырвоная Армія працягвае вам сваю руку дапамогі. Мы не заваёўнікі, а вызваліцелі. Вызваліўшыся ад прыгнёту паноў, памешчыкаў, вы самі ўстановіце для сябе парадак новага, свабоднага жыцця». Выконваючы агульную міратворчую задуму аперацыі, савецкія войскі імкнуліся пазбягаць узброенага супраціўлення з часцямі польскіх узброеных сіл. Вельмі лаяльнае стаўленне Чырвонай Арміі да польскіх войскаў абумоўлівалася шмат у чым акалічнасцю, што ў той час вялікая колькасць этнічных беларусаў і ўкраінцаў была заклікана ў польскую армію. Таму, калі польскія часткі не аказвалі супраціву і добраахвотна складвалі зброю, радавыя чыны практычна адразу распускаліся па дамах, інтэрнаваліся толькі афіцэры.

Рэгулярную дапамогу вызваліцелям насельніцтва лічыла сваёй кроўнай справай. У многіх гарадах і сёлах мясцовыя жыхары раззбройвалі прадстаўнікоў польскіх уладаў, паказвалі пераправы, паведамлялі каштоўныя разведданыя, збіралі і перадавалі чырвонаармейцам кінутыя польскай арміяй зброю і рыштунак. Насельніцтва гарадоў і вёсак Заходняй Беларусі сустракала воінаў Чырвонай Арміі як сваіх збаўцаў ад польскага прыгнёту.

28—30 кастрычніка 1939 года ў Беластоку адбыўся Народны Сход Заходняй Беларусі. Выказваючы непарушную волю народа, Сход прыняў дэкларацыю аб устараванні ў Заходняй Беларусі савецкай улады. Таксама Народны Сход звярнуўся ў Вярхоўны Савет СССР і БССР з просьбай прыняць Заходнюю Беларусь у склад Савецкага Саюза і БССР і ўз'яднанне беларускага народа ў адной сацыялістычнай дзяржаве. 2 лістапада гэтая просьба была задаволена, і заходнія вобласці ўз'ядналіся з Савецкай Беларуссю. Завяршальным заканадаўчым актам стала прыняцце III сесіяй Вярхоўнага Савета БССР 14 лістапада 1939 года закона, у якім было запісана: «Прыняць Заходнюю Беларусь у склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і аб'яднаць тым самым вялікі беларускі народ у адзінай Беларускай дзяржаве».

У канцы 1939 года на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі створаны пяць абласцей: Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая, Вілейская, Пінская — тэрыторыя і насельніцтва рэспублікі павялічыліся амаль удвая. Аб'яднанне беларускага народа ў рамках адзінай беларускай дзяржавы завяршыла працэс фарміравання і кансалідацыі беларускай нацыі і тым самым стала ўмовай яе росквіту ва ўсіх сферах жыццядзейнасці. Міжнароднае значэнне вызваленчага паходу часцей Чырвонай Арміі заключаецца ў тым, што ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР стала перадумовай будучай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне над нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Мікалай ШАЎЧЭНКА.

«Вада лілася ў агарод каскадам...»

НЕБЯСПЕЧНАЯ ДАРОГА

Я пабывала ў Путрышках на тыдні і магла ўпэўніцца ў наступствах залевы. Разам са старшынёй сельвыканкама Валерыем Байковым аб'язджаем самыя пацярпелыя тэрыторыі. Напачатку накіроўваемся на вуліцу імя Вачынскай. На першы погляд здаецца, што тут усё нармальна, на сядзібах цвітуць кветкі, расце гародніна, стаіць плот. Па дарозе старшыня расказвае, што вуліца названа ў гонар Героя Сацыялістычнай Працы Валянціны Вачынскай, якая ў савецкія часы працавала ў мясцовай сельгаспадарцы і дасягнула значных поспехаў у земляробстве. Вуліца развіваецца, тут у хуткім часе плануецца правесці газаправод і водаправод. Але цяпер жыхары заклапочаны стратамі. Калі ўважліва прыгледзецца да сядзіб, можна ўбачыць, што ў многіх прапала бульба, засохлі садовыя дрэвы, пажоўкла зеляніна на агародах.

З вялікім напружаннем удаецца зафіксаваць гэтыя факты ў нататніку: аўтамабіль раз за разам трапляе ў выбоіны. Аказваецца, гэта таксама наступствы моцных дажджоў. Каля дарогі ляжаць зламаныя галіны.

Крыху далей, на павароце, натыкаемся на вялікую расколіну. Яе таксама стварыла водная стыхія. Пасля дажджу сіламі мясцовай гаспадаркі сюды прывезлі пясок, але дрэнна разраўнялі, таму ёсць пагроза засесці ў гэтым пяску. Яшчэ ствараецца пагроза падмыву электраслупа, які стаіць якраз на месцы дарожнай расколіны.

Мой суразмоўца расказвае, што дарога падчас залевы была падобна на горную раку, патокі сцякалі ў агароды і нават дамы. Вада ішла і з поля, і з дарогі. Многія хаты проста плавалі. Вуглавы дом і некалькі за ім былі затопленыя. Сляды летніх стыхій відаць і цяпер.

Едзем па вуліцы Фестывальнай. Валерый Байкоў паказвае на дамы, якія пастаянна залівае. У адных, напрыклад, гараж аказаўся поўнасцю ў вадзе, а ваду з падвала дома адпампоўвалі ўжо тройчы. У суседніх дамах амаль такая ж гісторыя.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ЛАНДШАФТ СУПРАЦЬ ВЁСКІ

Амаль усе Путрышкі церпяць з-за падтапленняў. Адна з прычын — геаграфічная. Валерый Байкоў пастаянна ўказвае на перапады вышыні. Здаецца, што гэты фактар адыгрывае асноўную ролю ў бедах населенага пункта. Як кажуць, не пашчасціла... Вёска знаходзіцца на вышыні 120—130 метраў над узроўнем мора. За вёскай было балота, тут нізіна. З другога боку — даволі высокія пагоркі, якія дасягаюць 160 і больш метраў. Адтуль вада і сцякае проста на вуліцы, а ісці ёй далей няма куды.

Яшчэ адна з прычын пастаяннага падтаплення — вельмі слабая меліяратыўная сістэма, прычым яна не прадумана і не мае цэласнага падыходу. Няма паўнавартасных адводных каналаў. Праўда, камунальныя службы Гродна спрабавалі зрабіць водаадвядзенне, каб сюды з гарадскіх могілак не ішла вада. Але пакуль гэта работа праведзена не да канца.

У ліку негатыўных фактараў у аграгарадку называюць неабгрунтаваную вырубку дубовага гаю. Дрэвы абаранялі вуліцу Фестывальную ад сцёкаў з гарадскіх могілак, бо яны знаходзіліся вышэй населенага пункта. Некалькі гадоў таму было прынята рашэнне аб пашырэнні некропаля ў бок вёскі. Тады і высеклі векавыя дубы. Пасля гэтага сітуацыя абвастрылася.

...Мы рухаемся ўверх па гравійнай дарозе, якая вядзе праз вёску. Асфальт, дарэчы, тут — рэдкая з'ява, у асноўным ён пракладзены на галоўнай магістралі, ёсць, праўда, і бетонка, але не паўсюдна. Між тым дарога падымаецца ўгару.

Далей, па вуліцы Фестывальнай, высіцца дамба з пяску. Як патлумачыў Валерый Байкоў, пясковая агароджа павінна затрымаць вялікую ваду. Непадалёку вядзецца будаўніцтва двухпавярховага дома. Відаць, што асаблівасці ландшафту тут не ігнаруюць, бо падмурак даволі высокі. Каб такі прынцып захоўваўся і на ўсіх астатніх пабудовах, многія маглі б пазбегнуць сумных наступстваў. Але дамы будаваліся яшчэ да вайны, адразу пасля яе. Тады яшчэ такіх жудасных дажджоў не было. Па меншай меры, старажылы такога не памятаюць.

ЛЮДЗІ І ВЯЛІКАЯ ВАДА

Сядзіба пенсіянеркі Яніны Казіміраўны — у зоне рызыкі. Дом хоць і знаходзіцца ў самым цэнтры Путрышак, але ў нізіне. Жанчына кажа, што падтапленне ніколі не абмінае яе. Але такой залевы, як сёлета, яна не памятае. Вада запоўніла склеп, разлілася па агародзе. Камісія райвыканкама прыязджала і аглядала мясцовасць. Жанчыне паабяцалі, што да восені зробяць водаадводны канал. «Спадзяёмся, што дапамогуць», — кажа яна.

— У нас яшчэ цярпіма, — працягвае пенсіянерка, — а вось жыхарам вуліц, якія знаходзяцца бліжэй да лесу, не пазайздросціш: там многія дамы проста плавалі.

Дом Валянціны Уладзіміраўны па вуліцы Фестывальнай якраз з ліку такіх. Падчас

залевы ратавальнікі прыязджалі на адпампоўванне вады некалькі разоў. Вада стаяла на метр у вышыню. Агарод поўнасцю знішчаны, пацярпела і хатняя жыўнасць. Пяць курэй не паспелі выратаваць, і яны патанулі. У доме вада дасягала амаль паўметра. Падаставалі шпалеры, пад падлогай яшчэ прасочваецца вільгаць, набухла вапна на печцы. Рамонт прыйдзецца зноў рабіць, добра, што па страхоўцы выплацілі грошы. Сума выплаты, па словах жанчыны, склала паўтары тысячы рублёў. Але ці прастаіць доўга дом, які будаваўся яшчэ ў 40-х гадах мінулага стагоддзя, калі будзе пастаянна плаваць? Гэта пытанне вельмі непакоіць гаспадыню.

Спрабую прайсці ў дом з бетоннай агароджай, што на вуліцы Вачынскай. І зараз добра відаць, што тут пабывала вялікая вада. Да таго ж пабудова знаходзіцца каля самага размытага ўчастка дарогі. Аказалася, што не памылілася. Пенсіянерка Ядвіга Міхайлаўна прыгадала, што залевы здараліся і раней, але сёлета вада лілася ў агарод каскадам. А прыйшла яна з боку лесу і гарадскіх могілак. Бурлівы паток знішчыў бульбу, гародніну і садовыя дрэвы. У некаторых вымыла карані. Выстаялі толькі ягадныя кусты чарніц-фортэ. Іх гаспадыня пачала разводзіць нядаўна, упэўнена, што яны паляпшаюць зрок.

Жанчына расказала, што пабудавалі яны свой дом паўстагоддзя таму. З тае пары так і жывуць тут — яна з мужам і сын з сям'ёй. Ад імклівага патоку вырашылі ратавацца ўласнымі сіламі. Гаспадары заказалі і на днях устанавілі даволі трывалую бетонную агароджу даўжынёй амаль 15 метраў і больш чым метр у вышыню. Бар'ер для воднай стыхіі абышоўся ў 800 рублёў. Але ці спыніць паток вады гэтая агароджа, невядома, бо дарогу падсыпаюць пяском, і яна крыху паднялася.

ПАТРЭБНА СУЧАСНАЯ ЛІЎНЁЎКА

Між тым спробы справіцца з патопамі прымаліся і раней, але лакальна. Напрыклад, у Валянціны Уладзіміраўны з агарода да канавы праклалі трубу. Але вырашыць праблему не ўдаецца, бо з-за перападу вышыні вада зноў ідзе назад. Па ўсёй бачнасці, патрэбна паглыбіць канавы з улікам схілаў.

На думку старшыні сельвыканкама, аграгарадку неабходны магутны праект ліўнёвай каналізацыі. Але на гэта патрэбныя значныя сродкі. Як на праект, так і на яго рэалізацыю. Знайсці іх у мясцовым бюджэце складана.

Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што каналы тут ёсць. Яны, відаць, пракладзены яшчэ 40—50 гадоў таму. Але скіньць ваду пры магутных ліўнях не могуць. Дарожныя службы, паведаміў Байкоў, абяцалі, што зробяць патрэбны водаадвод. Каб вада ішла на поле і далей у меліяратыўныя каналы. А без гэтага застанецца эфект бутылачнага рыльца. Вада стаіць на месцы і не можа з-за вузкага праходу рухацца далей. Таму і падтапленне жыхароў такое маштабнае.

Між тым вёску не пакідаюць сам-насам з праблемай. Спецыяльная камісія выязджала на месца. Відавочна, праблемы з наступствамі падтаплення будуць вырашацца ў Гродзенскай гарадской жыллёва-камунальнай гаспадарцы. Пясчаная дамба — гэта першы этап. Прычым мера часовая, паведаміў **намеснік генеральнага дырэктара прадпрыемства Аляксей БОДЗІЧ.**

Па яго словах, зараз разглядаецца пытанне аб будаўніцтве вадаёмаў-выпарнікаў на гарадскіх могілках. Яны будуць назапашваць ваду, каб яна не ішла ў лясны масіў і далей — на вуліцы Путрышак. Але пакуль гэта пытанне ў стадыі разгляду, удакладніў прадстаўнік ЖКГ. Праекціроўшчыкі разглядаюць саму магчымасць размяшчэння вадаёмаў. Канчатковае рашэнне пакуль не прынята. Як аказалася, гэта самы праблемны населены пункт. Аб тым сведчаць і страты. Па падліках жыхароў, шкода ад залевы, якая адбылася 4 ліпеня, склала больш за 80 тысяч рублёў. Страты асобных гаспадарак вагаюцца ад адной да дзесяці тысяч рублёў. Найбольш пацярпелым аказаў дапамогу Беларускі Чырвоны Крыж. Гродзенскае аддзяленне прывезла прадуктовыя і гігіенічныя наборы, а таксама 400 літраў бутыляванай вады. Таксама былі выдзелены пасцельная бялізна, адзенне.

Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.

На слыху

КАНФІСКАВАЛІ 24 ТОНЫ БРАГІ

У рамках комплексу мерапрыемстваў, скіраваных на папярэджанне п'янства, супрацоўнікі міліцыі правялі некалькі рэйдаў у Маладзечанскім раёне па так званых самагонных міні-заводах.

Незаконную вытворчасць алкаголю праваахоўнікі выявілі ў вёсцы Яхімоўшчына. Уладальнікам «самагоннага цэху» быў 62-гадовы рамеснік. Пад міні-завод ён перабудаваў гаспадарчую пабудову на сваім прыватным падворку. Складовыя часткі апарата мужчына напалову ўкапаў у зямлю, зверху закідаўшы вытворчы агрэгат разнастайным хламам. Воданагравальнік размясціў у суседнім памяшканні, абклаўшы кацёл цэглай. Адпрацаваная вадкасць злівалася ў спецыяльна выкапаную яму за межамі прысядзібнага ўчастка.

Аднак канспірацыя не выратавала, канстатуе група інфармацыі і грамадскіх сувязяў Маладзечанскага РАУС. Самагонны апарат міліцыянеры канфіскавалі, як і партыю вадкасці, падобнай на брагу, у аб'ёме больш за 850 літраў, якая ў далейшым была знішчана. Акрамя таго, у гаражы мужчына захоўваў у каністры 10 літраў ужо гатовай да ўжывання самагонкі.

Узоры спіртазмяшчальнай вадкасці накіраваны на экспертызу. Па гэтым факце праводзіцца праверка. Сам гаспадар «самагоннага канвеера» заявіў, што рыхтаваў спіртное для сябе, зрэшты, маштабы вытворчасці, пустыя каністры для захавання, рэалізацыі тавару і папярэднія «заслугі» мужчыны выклікаюць сумневы ў міліцыі. Вясковец вядомы ў галіне вырабу самагону і праз гэта ўжо трапляў у поле зроку праваахоўнікаў.

«Заварылі» для асабістых патрэб — так у сваё апраўданне казалі супрацоўнікам міліцыі яшчэ два жыхары Маладзечанскага раёна. Але іх словам людзі ў пагонах не вераць і праводзяць адпаведныя праверкі. На момант, калі міліцыянеры наведвалі «алкасядзібы», гатовага прадукту ў іх не

было, апараты знаходзіліся ў разабраным стане, затое самагоннай брагі было ў дастатку.

У беспрацоўнага 48-гадовага жыхара вёскі Схоліна падчас агляду хлява праваахоўнікі знайшлі 16 палімерных ёмістасцяў, у якіх знаходзілася крыху больш за 14 тон брагі. У лютым гэтага года тут ужо быў ліквідаваны падпольны цэх. Гэты ж гаспадар запэўніваў, што гнаў самагон выключна для сябе. Тады міліцыя знішчыла больш за 20 тон брагі, канфіскавала 30 літраў гатовага «натурпрадукту» і апарат, а самагоншчык быў пакараны рублём.

Немалы штраф пагражае і 30-гадоваму жыхару вёскі Маліноўшчына, у якога ў гаспадарчай пабудове знайшлі каля 9 тон самагоннай брагі.

У абодвух выпадках паўфабрыкаты знішчаны.

Сяргей РАСОЛЬКА.
Фота з сайта УУС Мінскага аблвыканкама.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 29 (555)

Лепш раз убачыць

Пра Малевіча і Шагала — у доме Вішняка

А пры чым тут Джон Рыд?

Калі вы вырашыце наведаць слаўны горад Віцебск, малую радзіму вядомага на ўвесь свет мастака Марка Шагала, абавязкова прыходзьце ў Музей гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча. Ён знаходзіцца на вуліцы, якую назвалі ў гонар Майстра. Ад чыгуначнага вакзала пешшу хвілін дваццаць. Нават турысты, распешчаныя наведваннем самых знакамітых музеяў, будуць уражаныя ўбачаным.

Першы ў Беларусі...

Музей гісторыі Віцебскага мастацкага вучылішча — адзін з філіялаў Музея «Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва». Яго калектыў з'яўляецца лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі «За духоўнае адраджэнне» за стварэнне экспазіцыі музея і правядзенне маштабных выставачных праектаў «Восіп Цадкін. Вяртанне», «Аляксандр Родчанка. Фатаграфія з ВМАТЭМАЙСа» (Вышэйшыя мастацка-тэхнічныя майстэрні. — **Аўт.**).

Музей працуе ў тым самым будынку, дзе па ініцыятыве Марка Шагала ў 1918 годзе было створана Віцебскае народнае мастацкае вучылішча (афіцыйнае адкрыццё адбылося 28 студзеня 1919 года). Яно стала першай дзяржаўнай установай мастацкага профілю, якая была арганізаваная на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Сістэма выкладання творчых дысцыплін, створаная больш за стагоддзе таму, да гэтага часу з'яўляецца базавай для мастацкай адукацыі нашай краіны.

У 2011 годзе будынак, дзе знаходзіцца музей, перадалі з рэспубліканскай уласнасці ў гарадскую для стварэння ў ім Музея гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча.

У студзені 2013 года былі пачаты работы па рэканструкцыі будынка, што доўжыліся каля пяці гадоў. Гэты дом — адзін з нямногіх у Віцебску, які захаваўся з дарэвалюцыйнага часу да нашых дзён.

Дом, які належаў багацею

Тры з паловай года таму ў сценах, дзе працавалі Шагал і заснавальнікі авангарднага мастацкага аб'яднання «УНОВІС» («Сцвярджальнікі новага мастацтва»), прынялі першых наведвальнікаў.

Прыгожы дом быў узведзены ў 1913 годзе, і яго сцены, безумоўна, захавалі энергетыку той эпохі. Асабняк пабудаваў Ізраіль Вульфавіч Вішняк — адзін з самых багатых людзей Віцебска пачатку XX стагоддзя. Ён нарадзіўся ў 1853 годзе ў сям'і купца першай гільдыі. У пачатку XX стагоддзя Вішняк адкрыў у Віцебску банкірскую кантору. Таксама ён валодаў уласнымі дамамі на трох віцебскіх вуліцах, займаўся гандлем лесам і мануфактурай, аказваў экспедытарскія паслугі, быў заснавальнікам Віцебскай біржы, адным з дырэктараў і галоўных акцыянераў акцыянернага таварыства «Віцебскі трамвай», меў падрад на асвятленне часткі горада... А яшчэ ўваходзіў у склад апякунскай рады камерцыйнага вучылішча, камітэта народнай цвярозасці, быў старшынёй праўлення гарадскога таварыства дапамогі бедным хворым яўрэям і яўрэйскага пахавальнага таварыства...

Цікава, што адзін з шасці сыноў Вішняка, Якаў, стаў адным з актыўных рэвалюцыянераў. І быў камісарам Петраградскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта. Якаў Вішняк згадваецца ў знакамітай кнізе амерыканскага пісьменніка Джона Рыда «Дзесяць дзён, якія ўзрушылі свет». Малавядомы факт, дарэчы.

Навуковая лабараторыя

Навуковая канцэпцыя Музея гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча заснавана на даследаваннях вядучых спецыялістаў па рускім авангардзе, якія працуюць у Беларусі і іншых краінах.

І ў мінулым годзе, калі сусветная грамадскасць і Беларусь святкавалі стагоддзе з часу стварэння ў Віцебску творчага аб'яднання УНОВІС, Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва правёў Міжнародную навукова-практычную канферэнцыю, мэтай якой стала абмеркаванне ўплыву УНОВІСа на мастацкую культуру XX стагоддзя.

У канферэнцыі ўзялі ўдзел даследчыкі і спецыялісты з розных краін, якія працуюць у галіне тэорыі і гісторыі авангарда: мастацтвазнаўцы, мастакі, прадстаўнікі музеяў і выдавецтваў.

А сёлета (да 25 снежня) арганізаваны Міжнародны конкурс плаката, прысвечаны 130-годдзю з дня нараджэння аднаго з выкладчыкаў мастацкага вучылішча Эль Лісіцкага, якое адзначалася ў 2020 годзе. Асноўныя мэты конкурсу — прыцягненне да ўдзелу прафесійных дызайнераў і студэнтаў, а таксама папулярызацыя творчасці Эль Лісіцкага і спадчыны Віцебскай мастацкай школы. Выстава работ пераможцаў конкурсу плануецца вясной наступнага года.

Дарэчы, у 2020 годзе ў Беларусі ў гонар юбілею творчага аб'яднання УНОВІС створана лімітаваная серыя наручных гадзіннікаў, якія былі і застаюцца хітом продажаў.

Выставачныя залы і не толькі

Сярод філіялаў Музея «Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва» — знакамітая арт-прастора «Талстога, 7», якая спецыялізуецца на правядзенні выстаў сучасных аўтараў і творчых аб'яднанняў. Таксама на «Талстога, 7» праходзяць музычныя і літаратурныя вечары, адукацыйныя семінары і лекцыі, навуковыя канферэнцыі, кінапаказы, творчыя сустрэчы з мастакамі і майстар-класы.

А ў выставачнай зале, што знаходзіцца ў дарэвалюцыйным будынку побач з Летнім амфітэатрам (праспект Фрунзэ, 11), акрамя разнастайных зменных экспазіцый, працуе найстарэйшы ў Беларусі Віцебскі народны кінаклуб «Дыялог» пад кіраўніцтвам Сяргея Матылёнка. Па традыцыі, гэтая зала таксама з'яўляецца рэпетыцыйнай пляцоўкай Віцебскага маладзёжнага хору пад кіраўніцтвам Аляксандра Раўза.

Самы новы творчы праект Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва — Музей фатаграфіі імя Сігізмунда Юркоўскага (вул. Талстога, 7). Ён створаны з мэтай прадставіць гісторыю развіцця сусветнай фатаграфіі, уключаючы творчасць майстроў-фатографаў з Віцебска.

У 1867 годзе Юркоўскі адкрыў у Віцебску фотаатэлье на Замкавай вуліцы. У 1882 годзе прыдумаў імгненны фатаграфічны затвор, а ў 1883 годзе — шторна-шчылінны, які стаў прататыпам сучасных фотаапаратаў.

Некалькі год запар у Віцебску на базе Музея фатаграфіі праходзіць адзіны ў нашай краіне фестываль фатаграфіі «ФотаКрок», у якім удзельнічаюць майстры з розных краін свету.

(Больш падрабязна пра некаторыя філіялы Музея «Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва» газета «Звязда» раскажа ў наступных нумарах.)

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота аўтара і з архіва музея.

У ЧАКАННІ АДКРЫЦЦЯ

Блізіцца 89-ы сезон у Вялікім тэатры Беларусі

У тэатрах летнія месяцы лічацца «мёртвым» сезонам: не адбываюцца прэм'еры, ды і агульная праграма паказаў робіцца значна меншай. Але ў гэтым ёсць і плюсы. Пасля перапынку гледачы, якія паспелі засумаваць па спектаклях, з вялікай ахвотай і нецярпеннем вяртаюцца восенню ў тэатры. Вось і Вялікі тэатр Беларусі анансаваў новы, 89-ы, сезон. Адкрыццё запланавана на 8 і 9 верасня.

Фота Міхаіла НЕСЦЕРАВА.

Алена БАЛАБАНОВІЧ, вядучы рэдактар службы маркетынгавых камунікацый Вялікага, распавяла «Звязде» аб прэм'ерах тэатра:

— Мы адкрываем наш сезон прэм'ерай, што ўжо даўно стала добрай традыцыяй: 8 і 9 верасня на нашай сцэне адбудзецца пастаноўка рэжысёра Ганны Маторнай — опера Уладзіміра Солтана «Дзікае паляванне караля Стаха». Адкрыемся операй, а вось першыя балеты сезона гледачы ўбачаць 10 і 11 верасня. Гэта будзе чароўны «Шчаўкунок» у пастаноўцы легендарнага харэографа Валянціна Елізар'ева. Заслужаны артыст Расіі Міхаіл Губскі выступіць 12 верасня ў ролі Радамеса ў оперы Джузепэ Вердзі «Аіда». Мы чакаем «заморскіх» гасцей і ў наступныя месяцы. Так, 16 кастрычніка ў сольным канцэрце беларускай опернай дзівы Аксаны Волкавай прымуць удзел зоркі, якія даўно заваявалі сусветныя сцэны: Уладзіслаў Сулімскі і Святлана Касьян. Дарэчы, Сулімскі, саліст Марыінскага тэатра ў Санкт-Пецярбургу, 19 кастрычніка выйдзе на сцэну Вялікага тэатра Беларусі ў якасці Макбета. Каманда пастаноўшчыкаў пад кіраўніцтвам харэографа народнага артыста Беларусі Юрыя Траяна рыхтуецца прадставіць публіцы прэм'еру балета Радзівона Шчадрына «Канёк-Гарбунок». У новым сезоне ў афішы Вялікага мы пабачым і новую рэжысёрскую работу Аксаны Волкавай. Заслужаная артыстка Рэспублікі рыхтуе оперу Каміля Сен-Санса «Самсон і Даліла».

Нагадаем аб яшчэ адной знакавай для Тэатра оперы і балета даце: 27 жніўня народная артыстка Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, галоўны хормайстар Вялікага тэатра Ніна Ламановіч адзначае 70-гадовы юбілей. Ніна Ламановіч прыйшла ў тэатр, калі ёй было 25 гадоў. І вось ужо 45 гадоў запар працуе ў ім.

Фота Паўла СУШЧОНКА.

— Хор для кожнага рэжысёра — галаўны боль. Гэта маса спевакоў, якія «раскіданы» па сцэне, але яны павінны дыхаць як адзіны арганізм. Таму хормайстар павінен так падрыхтаваць сваіх артыстаў, каб дырыжору было лёгка. І я заўсёды імкнуся рабіць сваю працу па максімуме, — кажа Ніна Ламановіч.

Завітвайце ў Вялікі тэатр Беларусі, каб пазнаёміцца з новай праграмай 89-га сезона!

Арына КАРПОВІЧ.

Вернісажы

ПРАВА БЫЦЬ

Персанальнае прысвячэнне мастачкі Зоі Луцэвіч

Яскрава, імпульсіўна, гарэзліва... Так існуе ў творчасці Зоя Луцэвіч, мастачка з адметным пачуццём колеру, якое нараджаецца дзякуючы фантастычнаму жыццялюбству. І калі яго нестае ці проста трэба набрацца сіл перад асенне-зімовым сезонам, то абавязкова трэба наведаць прастору «Арт-Фабрыка» ў цэнтры сталіцы, дзе праходзіць выстаўка «Жыццё як мастацтва». Таму што гэта не проста паход на выстаўку, а сыход у іншасвет, у якім няма цемры. І справа не толькі ў колерах...



Таму што вялікая персанальная выстаўка Зоі Луцэвіч — гэта перамога жыцця. Над усім, што можа яго азмрочыць. Але насамрэч усё залежыць ад нашага разумення сутнасці і ўспрымання самых розных падзей. Што і дэманструе найперш сама аўтарка. Вялікая выставачная прастора напоўненая радасцю і адчуваннем каштоўнасці кожнага імгнення. Мудрагелістыя вобразы, гульня сімвалаў і сэнсаў, але загадкі самі па сабе такія вытанчаныя, што расшыфроўкай можна і не займацца, бо розум ашаломлены буйствам колераў і пачуваецца гарманічна-разняволена. Нават дзіўнаватае адчуванне на выставе Зоі Луцэвіч, якая любіць гуляць з гледачом. А тут колератэрапія ўзмацняецца кветкатэрапіяй — яны нібыта выходзяць з работ у залу, напаўняючы яе цеплынёй і пяшчотай. У кветках Зоі шмат любові, гэта, здаецца, сямейнае.

Сваю юбілейную выставу Зоя Луцэвіч прысвяціла маці, мастачцы Святлане Катковай, якая пакінула гэты свет напрыканцы мінулага года. Творчая натура, па-сапраўднаму апантаная мастацтвам, яна пісала да апошняга, ператвараючы віды з бальнічнай палаты ў задумлівыя пейзажы. Але крыніцай яе натхнення былі кветкі — іх заўсёды было шмат на яе работах. Шмат і ў гэтыя жнівеньскія дні, бо іх маці падарыла дачка: іх сумеснае чалавечае і творчае жыццё ідзе далей. У галерэі «Арт-Фабрыка» адчуваеш гэта вельмі востра, а таксама разумееш і бачыш на свае вочы вядомае яшчэ са школы: энергія не знікае. Зоя піша і гаворыць пра маму толькі ў цяперашнім часе. Таму што жывое яе мастацтва (яно ж наогул вечнае!). Таму, што таленавіты яе працяг — дачка, якая ўражвае вобразамі, формамі і ўвасабленнем жыццялюбства. І таму, што Зоя таксама мае творчае атачэнне (яна не самотная) і прыцягвае тых, хто гатовы ператвараць і ператвараць свет кветкамі, колерамі, фантазіямі. І любоўю. Бо тут усё — прызнанне ў любові. Каму?

Работы розных гадоў — за чатыры дзясяткі гадоў, калі Зоя пачала жыць мастацтвам. У сям'і з багатымі творчымі традыцыямі, здаецца, шлях дзяўчынкі быў прадвызначаны. Дзядуля Зоі — вядомы мастак-педагог Сяргей Каткоў, які ўмеў працаваць з дзецьмі, не толькі вучыў маляваць, але і абуджаў у іх асобу. Няма чаго дзівіцца, што мастачкай стала яго дачка Святлана. Ад яе творчы імпульс узяла Зоя — з дзяцінства яна хацела рабіць сваё мастацтва. Вядомае выслоўе «Я мастак, я так бачу» яна ўспрыняла як права на творчасць, якая будзе не падобная ні на чыю, і з юнацтва гатовая была абараняць гэтае права, нават у Германію вучыцца паехала. У яе была падтрымка — не толькі маці Святлана, але і маці Зоя Літвінава, якая была хроснай дзяўчынкі, стала для яе прыкладам творчай індывідуальнасці. І Зоя Луцэвіч стала працаваць без аглядкі на правілы і ўмоўнасці, тым больш што за ёй яшчэ была адна творчая лінія — прозвішча па-бацьку ідзе ад роду Янкі Купалы. Зоя нібыта нарадзілася і расла з адчуваннем, што быць творцам — гэта значыць быць сабой.

Цяпер Зоя Луцэвіч — мастачка, чые творы выстаўляліся ў самых розных краінах: ад Еўропы да ЗША. Яна ўмее працаваць у самых розных відах мастацтва: графіцы, жывапісе, кераміцы, працуе з тэкстылем, стварае плакаты, прапануе канцэптуальныя інсталяцыі, арт-аб'екты ды відэа-арт. Яна наогул адкрытая да эксперыментаў, за якімі цікава назіраць. Калі прыходзіць нейкая нерэальная ідэя, то Зоя ў рэальнасці знойдзе магчымасць ператварыць яе ў адмысловы фантастычны праект. Хто сочыць за яе творчасцю, той мог ацаніць яе аўтарскія талеркі ды кубкі, столікі для кавы ці малюнкі на аўташкле. Дарэчы, яе сутворца, скульптар Дзіма HID, які займаецца аэраграфіяй на аўтамабілях, вельмі арганічна стаў удзельнікам персанальнай выстаўкі Зоі ў «Арт-Фабрыцы».

Яна наогул шчодра дзеліцца часткай сябе з сябрамі і блізкімі — і энергіяй твораў, і энергіяй кветак — іх яна дорыць сваім дзвюм мамам, якіх лічыць вялікімі мастачкамі і чыім меркаваннем заўсёды даражыла. Іх творы таксама размясціліся на выстаўцы Зоі Луцэвіч, таксама як і даніна павагі аддадзена заснавальніку мастацкай дынастыі Сяргею Каткову. Святлане Катковай наогул былі прысвечаны асобныя імпрэзы ў межах выстаўкі дачкі: 16 жніўня адзначылі дзень нараджэння Зоінай мамы з расповедам пра яе творчасць і кветкамі для яе — акварэлі мастачкі, якія пакуль нідзе не выстаўляліся, можна было ўбачыць тут. Вечар памяці стаў вечарам угаранавання. Усё, як яна хацела: яны выставіліся разам — Сяргей Каткоў, Святлана Каткова, яе сяброўка па жыцці Зоя Літвінава, яе дачка Зоя, яе ўнук Ян Вінцэнт... Іскрынка таленту перадаецца ў пакаленнях і запальвае агеньчык, саграваючы тых, хто судакранаецца з гэтымі творцамі.

Гэтымі днямі нагод для судакранання становіцца больш: з 23 жніўня працуе выстава Святланы Катковай у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, дзе прадстаўлены жывапіс і акварэлі. Але «Арт-Фабрыка» не адстае і таксама захоўвае магчымасць знаёмства з гэтай мастачкай і найлепшым, што яна стварыла за жыццё.

Прысвячэнне Зоі — гэта не проста ўдзячнасць дачкі, гэта пяшчота, якая праступае праз штрыхі і мазкі, расцякаецца праз фарбы і яскрава адцяняе светлыя пачуцці, якія перасягаюць Сусветы і прасторы. Гэта нечаканая выстаўка Зоі, якая ва ўсіх выстаўках заўсёды паўставала як магутная асоба. Тут яе персанальнае «я» не выпірае, прытым што навідавоку магутная плынь аўтарскага свету. Яе персанальнае «я» праступае праз адчуванне жыцця тых, хто прыйшоў перад ёй. Гэта ўдзячнасць не толькі за права быць сабой, а наогул за права быць у гэтым свеце, памножаная на любоў. А яна не знікае і суправаджае кожны крок, кожны жэст, кожнае слова. Разумееш — і хочацца жыць.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Жыццё тэатра

ФЕСТЫВАЛЬНЫ «ВІЙ» І МІСТЫЧНАЯ «ЧОРНАЯ ПАННА НЯСВІЖА»

Палескі драматычны тэатр адкрыў свой 16-ы сезон

У сярэдзіне жніўня Палескі драмтэатр у Пінску зноў адчыніў дзверы для свайго гледача. Першым спектаклем сезона стала містычная легенда ў адной дзеі «Чорная панна Нясвіжа». Гэтай легендзе больш за чатыры сотні гадоў. Яна грунтуецца на рэальнай гістарычнай падзеі, у цэнтры якой, вядома, каханне. Малады польскі манарх Жыгімонт палюбіў ліцвінку Барбару з роду Радзівілаў. Але маці Жыгімонта каралева Бона супраць гэтага шлюбу, яна загадвае атруціць юную нявестку... Спектакль у пастаноўцы Паўла Марыніча зроблены ў духу шэкспіраўскай «Рамэа і Джульеты». Героі пражываюць на сцэне і ракавое каханне, і страту блізкага чалавека.

Юным гледачам у гэтыя дні прапануецца «Казка пра мёртвую царэўну» па матывах твора А. С. Пушкіна. А ў канцы месяца тэатр дае «Вія» — спектакль, прэм'ера якога адбылася год таму. Жанр пастаноўкі яе аўтары вызначылі як horror у дзвюх дзеях па матывах аповесці Гогаля. У спектаклі цесна перапляліся і бліскучы гумар, і сапраўдныя жахі, і філасофскі роздум пра неўладкаванасць быцця і месца ў ім маленькага чалавека, які змагаецца з непераадольнымі абставінамі...

Як паведаміў карэспандэнту газеты дырэктар тэатра і яго мастацкі кіраўнік Аляксандр Лукашэнка, «Вій» ужо трапіў у тройку намінантаў Нацыянальнай прэміі ў намінацыі «Найлепшы спектакль на малой сцэне». Інтрыга павінна вырашыцца ў канцы восені. А пакуль тэатральная трупа радуе пастаноўкай свайго палескага гледача. 15 верасня спектакль рэжысёра Паўла Марыніча «Вій» будзе ўдзельнічаць у фестывальнай праграме «Белай Вежы» на сцэне Брэсцкага тэатра лялек.

Варта сказаць, што рэпертуар Палескага драматычнага тэатра надзвычай багаты. Аматары тэатральнага мастацтва ўжо прывыклі, што кожныя паўтара-два месяцы тут адбываецца прэм'ера. Ставяцца як класічныя творы, так і сучасная замежная драматургія, п'есы беларускіх аўтараў.

Днём нараджэння тэатра лічыцца 14 сакавіка 2006 года. Хоць гісторыя тэатральнага руху ў Пінску насамрэч налічвае больш за стагоддзе. Тэатр у горадзе быў і на пачатку XX стагоддзя. А ў 1939 годзе ў Пінску быў створаны Палескі абласны драматычны тэатр. Для гэтага ў Пінск перавезлі Заслаўскі калгасна-саўгасны тэатр. Аднавіў сваю работу тэатр ужо ў 1946 годзе. І ў першы пасляваенны год на яго сцэне адбылося аж пяць прэм'ер. Але пасля таго, як Пінск пазбавіўся статусу абласнога цэнтра, тэатр перавялі ў Магілёў. Будынак перадалі Дому культуры.

Ды пінскія аматары Мельпамены не здаваліся і арганізавалі самадзейную трупу, якая праз некалькі гадоў стала народным аматарскім калектывам. З 1992 года калектыў быў рэарганізаваны ў паўпрафесійны тэатр-студыю «Дыяген». Сваёй дзейнасцю «дыягенаўцы» давялі, што тэатральнае мастацтва запатрабавана ў горадзе, што прыйшоў час адрадзіць прафесійную трупу і надаць ёй афіцыйны статус. І тэатр у 2006-м быў адкрыты. Пасля рэканструкцыі яму перадалі гістарычны будынак — дарэчы, помнік архітэктуры, што ўключаны ў Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

УЛАДЗІМІР ЦАРУК: ЛЕГЕНДАРНЫ РЭВАЛЮЦЫЯНЕР І ПАРТЫЗАН

Ёсць у нашай гісторыі яркія асобы, постаці, імёнамі якіх не названы вуліцы вялікіх гарадоў ці буйных прадпрыемстваў, ім не пастаўлены велічныя помнікі на плошчах, у іх памяць не праводзяцца спартыўныя турніры, пра іх не здымаецца кіно... Але ад гэтага іх роля не становіцца менш важкай. Бо ёсць людская памяць, яе сцерці нельга. Сённяшні наш расповед пра Уладзіміра Зянонавіча Царука, Героя Савецкага Саюза, актыўнага ўдзельніка падпольнай барацьбы працоўных Заходняй Беларусі ў 1920—1930-х гадах, а ў гады Вялікай Айчыннай вайны — камандзіра цэлага партызанскага злучэння, якое ў час акупацыі паспяхова дзейнічала ў Стаўбцоўска-Мірскай зоне.

У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Нарадзіўся Уладзімір Царук 20 снежня 1899 года ў вёсцы Вялікая Обрына, што ў цяперашнім Карэліцкім раёне, у сялянскай сям'і. У 1912 годзе скончыў Ярэміцкае народнае вучылішча, а пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года, у 19 гадоў, быў выбраны сакратаром валаснога рэўкома там жа, у Ярэмічах. У гады Грамадзянскай вайны стаў чырвонаармейцам, а затым палітруком роты 72-га стралковага палка, па іншых звестках — 10-га Мінскага палка ВЧК. Пасля Рыжскага мірнага дагавора, які падзяліў Беларусь, — на падпольнай працы ў Заходняй Беларусі, быў абраны сакратаром Мірскага падпольнага райкама КПЗБ.

Уладзімір Царук удзельнічаў у арганізацыі дэманстрацый і мітынгаў у Карэлічах і Міры, вёў падпольную партыйную работу, якая была складанай і небяспечнай. Напрыклад, у 1925 годзе падпольшчыкам удалося выявіць у радах слонімскай партыйнай арганізацыі агента польскай сакрэтнай службы «Дэфензіва» па мянушцы «Кузьма», які здаў паліцыі шэраг актыўных падпольшчыкаў. Правакатар быў ліквідаваны.

17 верасня 1926 года паліцыя выйшла на след самога Уладзіміра Зянонавіча, яго арыштавалі. Неўзабаве адбыўся суд. Уладзіміру Царуку як «асабліва небяспечнаму дзяржаўнаму злачынцу, які падбухторваў сялян да бунтаў» і як саўдзельніку ў забойстве агента тайнай паліцыі, пракурор адразу запатрабаваў смяротнага пакарання. Суд пад ціскам грамадскасці, баючыся новых хваляванняў, даў яму «ўсяго» 10 гадоў турмы плюс яшчэ чатыры — за членства ў забароненай Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Пракурор апратэставаў гэтае рашэнне, і тады суд больш высокай інстанцыі, у Варшаве, выносіць бязлітаснае рашэнне — пажыццёвае зняволенне. Пацягнуліся доўгія, змрочныя турэмныя гады. 13 гадоў у турмах Навагрудка, Вільні, Равіч (невялікі гарадок за некалькі кіламетраў ад польска-нямецкай граніцы). Тут, у равіцкай турме, Уладзімір Зянонавіч пазнаёміўся з Сяргеем Восіпавічам Прытыцкім, будучым вядомым дзяржаўным дзеячам БССР.

1 верасня 1939 года немцы напалі на Польшчу, пачалася вайна. Зняволеных равіцкай турмы не паспелі эвакуіраваць, ахова турмы разбеглася, і арыштанты таксама. Царук з Прытыцкім накіраваліся ў Варшаву, жадаючы прыняць удзел у яе абароне ад вермахта. Не здолеўшы прабіцца праз кальцо акружэння, абодва яны дабраліся да Беластока, дзе і сустрэлі Чырвоную Армію, якая пачала 17 верасня 1939 года свой Польскі паход.

Пра гэтыя факты з яго біяграфіі расказваецца ў дакладной запісцы сакратара ЦК КП(б) Б Мікалая Яўхімовіча Бюро ЦК «Па справе т. Царука У.З.» у лістападзе 1942 года:

> *«У польскіх турмах прасядзеў 13 гадоў. Вызваліўся з турмы ў верасні 1939 года ў сувязі з польска-германскай вайной... Прымаў актыўны ўдзел ва ўстанаўленні савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Быў выбраны дэпутатам у Народны сход Заходняй Беларусі, а затым дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР».*

Як вядома, Народны сход Заходняй Беларусі праходзіў у Беластоку 28—30 кастрычніка 1939 года. У яго рабоце ўдзельнічалі 926 дэлегатаў, прысутнічалі члены ўрада Савецкай Беларусі, прадстаўнікі грамадскасці, у тым ліку Я. Купала і Я. Колас.

Народны сход прыняў дэкларацыю аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад Беларускай ССР і СССР, прыняў рашэнне аб канфіскацыі земляў памешчыкаў, нацыяналізацыі буйных прадпрыемстваў, банкаў. «З гэтага часу, гаварылася ў дэкларацыі, уся ўлада ў Заходняй Беларусі належыць працоўным горада і вёскі ў асобе дэпутатаў працоўных». Сярод 12 чалавек, якія падпісалі дакумент, стаіць і подпіс Царука.

І далей ужо ішла канкрэтная, штодзённая работа па напаўненні заяўленых мэт канкрэтным зместам. Уладзімір Зянонавіч у гэты час працуе намеснікам старшыні Стаўбцоўскага райвыканкама, загадчыкам Стаўбцоўскага райдараддзела, затым — старшынёй Стаўбцоўскага райсавета дэпутатаў працоўных. У сакавіку 1940-га абіраецца дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

ПУШЧАНСКІ КАМАНДЗІР

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны Уладзіміру Царуку прыйшлося эвакуіравацца на ўсход; многія прадпрыемствы Баранавіцкай вобласці былі напраўлены на Тамбоўшчыну. Тут і апынуўся Уладзімір Зянонавіч. Некаторы час працаваў намеснікам дырэктара адной з МТС. Працаваў, чакаючы адказу на просьбу ў ЦК КП (б) Б накіраваць яго ў тыл ворага для ўдзелу ў партызанскай барацьбе. Тут яму дапамагло даўняе знаёмства з Прытыцкім і Міхаілам Зімяніным. У дакладной запісцы на імя першага сакратара ЦК Панцеляймона Панамарэнкі яны пісалі: «Лічым неабходным прыцягнуць для работы... у тыле нямецка-фашысцкай арміі наступных таварышаў, якія добра ведаюць работу ў заходніх абласцях Беларусі». Далей называліся прозвішчы Веры Харужай, Данілы Данішэўскага, Васіля Самуціна. Асобна гаварылася пра Царука:

> *«Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, былы старшыня Стаўбцоўскага райвыканкама... Добра ведае ўмовы падпольнай работы. Знаходзіцца ў Тамбове. Можна накіраваць у Вілейскую вобласць».*

У студзені 1942 года Уладзіміра Царука выклікалі ў Маскву і залічылі ў рэзерв ЦК КП (б). Нейкі час ён працаваў у Беларускім штабе партызанскага руху. У абавязкі Царука ўваходзіла забеспячэнне падрыхтаваных да закідвання ў варожы тыл груп зброяй, боепрыпасамі, узрыўчаткай, радыёстанцыямі. Як адзначаў у характарыстыцы Уладзіміра Царука ў сувязі з прадстаўленнем яго да ўзнагароджання ордэнам Чырвонай Зоркі начальнік БШПР брыгадны камісар П. З. Калінін, «У. Царук правёў вялікую работу па забеспячэнні ўзбраеннем і боепрыпасамі партызанскіх атрадаў. За перыяд сваёй работы начальнікам базы ўзбраення забяспечыў узбраеннем і боепрыпасамі 2 тысячы партызан, накіраваных у тыл ворага».

Але сам ён хацеў непасрэдна змагацца з фашыстамі. Таму неўзабаве яго накіравалі на Калінінскі фронт, дзе членам Ваеннага савета 3-й ударнай арміі быў П. Панамарэнка. Тут была арганізавана Паўночна-Заходняя аператыўная група, у склад якой і быў уключаны У. Царук. У сакавіку 1943 года Беларускі штаб партызанскага руху накіроўвае яго ў тыл ворага, у Баранавіцкую вобласць. «Быў членам падпольнага абкама, піша ён у сваёй біяграфіі, кіраваў міжрайцэнтрам, у які ўваходзілі пяць раёнаў, пяць партызанскіх брыгад і адна брыгада кавалерыі, дзе я быў камандзірам партызанскага злучэння Стаўбцоўскай зоны. Выпускалі мы пяць падпольных газет і лістоўкі. Таксама я быў першым сакратаром падпольнага Стаўбцоўскага РК КП (б) Б».

У Стоўбцы фашысты сагналі каля 2000 маладых хлопцаў для стварэння падраздзялення «Беларускай краёвай абароны». Царук накіраваў у іх рады агітатараў і неўзабаве амаль усе рэкруты разбегліся, а больш як 600 з іх уступілі ў партызанскія атрады. У павелічэнні шэрагаў народных мсціўцаў сваю ролю адыгралі і партызанскія друкарні, якія выпускалі газеты, плакаты і лістоўкі. Сталі стварацца новыя атрады і брыгады, што дазволіла праводзіць супраць ворага маштабныя акцыі.

18 красавіка 1943 года Царук асабіста ўзначаліў аперацыю па разгроме гарнізона ў мястэчку Мір, дзе адпачывалі і праходзілі падрыхтоўку гітлераўскія лётчыкі. Падпольшчыкі здабылі пароль. Група партызан, пераапранутых у гітлераўскую форму, зняла ахову. Следам у гарнізон уварваліся асноўныя партызанскія сілы атрадаў «Камсамолец» і імя Воранава. У вокны будынкаў паляцелі гранаты. Гітлераўцы выскоквалі з вокнаў на вуліцу, іх даганялі аўтаматныя чэргі. Да раніцы гарнізон быў разгромлены цалкам.

Улетку 1943 года, падчас правядзення фашыстамі аперацыі «Герман», калі блакаду Налібоцкай пушчы супраць 3,5 тысячы партызан вяла 50-тысячная карная экспедыцыя, рака Нёман стала мяжой, дзе партызаны «дзядзькі Валодзі» — такім быў партызанскі псеўданім Царука — вялі жорсткія баі. Над пушчай павіслі бамбардзіроўшчыкі. Па лясных дарогах пайшлі карнікі, танкі і спецыяльныя каманды салдат з аўчаркамі. Гэтай армадай камандаваў асабіста обергрупенфюрэр СС Курт фон Готберг.

Царук разумеў: так проста з блакіраванай Налібоцкай пушчы не ўцячы — у лесе жывуць партызанскія сем'і, функцыянуюць шпіталі, ёсць аэрадром для прыёму самалётаў з Вялікай зямлі. Ён прыняў рашэнне атрадам рассяродзіцца і, свабодна манеўруючы, з усіх бакоў біць карнікаў.

Амаль цэлы месяц ішла жорсткая барацьба на межах лясных масіваў. На шляху ў Івянец партызаны захапілі штаб падпалкоўніка СС Аскара Дзірлевангера, і план аперацыі «Герман» апынуўся ў руках Царука. Гэта дапамагло не толькі сапраўды манеўраваць, але і ўстройваць засады ў самых нечаканых для ворага месцах. Страціўшы нямала салдат і баявой тэхнікі, карнікі згарнулі аперацыю, адправіўшы ў Берлін данясенне, што «ўсе партызаны знішчаны».

У 1944 годзе ў Стаўбцоўскім партызанскім злучэнні было ўжо пяць брыгад — «Камсамолец», імя 1 Мая, імя 25-годдзя БССР, імя Маршала Г. К. Жукава, імя Суворава. Гэта былі тысячы добра ўзброеных байцоў. Яны грамілі гітлераўскія гарнізоны, узрывалі чыгуначныя і шашэйныя масты, зрывалі будаўніцтва гітлераўскіх абарончых аб'ектаў. Уладзімір Царук асабіста распрацоўваў планы удараў па варожых камунікацыях.

20 чэрвеня 1944 года злучэнне Царука ў поўным складзе выйшла на чыгунку. Тысячы рэек узляцелі на паветра. На станцыях захраслі варожыя эшалоны, становячыся лёгкай здабычай савецкай авіяцыі. 6 ліпеня 1944 года партызаны Царука злучыліся з надыходзячымі часцямі Чырвонай Арміі.

Выконваючы распараджэнне камандавання, партызаны Царука ўзялі пад кантроль дарогу Дзяржынск — Стоўбцы — Мір — Карэлічы — Навагрудак і заблакіравалі шляхі адыходу акупантаў. Завязаліся ўпартыя баі. Каб не даць ворагу схавацца ў глухіх лясах Налібоцкай пушчы, частка атрадаў заняла абарону ўздоўж усходняй ускраіны пушчы ад Стоўбцаў да Валожына. Тут быў разгромлены варожы 217-ы пяхотны полк, большасць салдат праціўніка захоплена ў палон.

Усяго ж партызанскімі брыгадамі пад камандаваннем Уладзіміра Царука было спушчана пад адхон 555 варожых воінскіх эшалонаў, разбіта 3263 вагоны, забіта 33 940 гітлераўцаў, знішчана 325 аўтамашын, узарвана 646 шашэйных і чыгуначных мастоў.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 жніўня 1944 года за ўмелае камандаванне партызанскім злучэннем, узорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і праяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм Уладзіміру Зянонавічу Царуку было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медалі «Залатая Зорка».

ПАСЛЯ ВАЙНЫ

У кастрычніку 1944-га Уладзімір Зянонавіч быў прызначаны галоўным прадстаўніком СНК БССР пры ўпаўнаважаным польскага ўрада па перасяленні польскага насельніцтва з Беларусі ў Польшчу. Гэта была вельмі складаная праца. Граніца мянялася, частка раёнаў БССР адыходзіла да Польшчы, тысячы людзей пераязджалі з месца на месца, узнікалі нявырашальныя маёмасныя пытанні. Уладзімір Царук неаднаразова звяртаўся да намесніка Старшыні СНК Кузьмы Кісялёва з хадайніцтвам перад НКУС аб забароне праводзіць неабгрунтаваныя арышты грамадзян, якія пераязджаюць, бо гэта «нервуе людзей, негатыўна характарызуе палітыку партыйных і савецкіх улад па перасяленні». Дзейнасць У. Царука па справах эвакуацыі атрымала адабрэнне кіраўніцтва і БССР, і Польшчы.

У канцы 1947-га Уладзімір Царук становіцца намеснікам старшыні Баранавіцкага аблвыканкама, у лістападзе 1951-га — старшынёй Баранавіцкага гарвыканкама. На той момант гэта быў абласны горад, які актыўна развіваўся. Абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР і Вярхоўнага Савета СССР.

Ён памёр 27 студзеня 1957 года, не пражыўшы і 58 гадоў. Імя Уладзіміра Зянонавіча Царука носяць вуліцы ў Баранавічах, Лідзе, Стоўбцах, Карэлічах. У вёсцы Вялікая Обрына, на яго радзіме, створаны мемарыяльны музей, а ў Ярэмічах Герою Савецкага Саюза ўстаноўлены бюст. Ужо ў 1999 годзе рашэннем Баранавіцкага гарадскога Савета дэпутатаў У. З. Царуку прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Баранавічы».

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

З нагоды

«Журналіст — гэта той, хто адказвае за свае словы»

Што ўяўляе сабой вядучы навучальны і навуковы цэнтр у сферы медыя ў Беларусі? Мы сустрэліся з дэканам факультэта журналістыкі БДУ Вольгай САМУСЕВІЧ і даведаліся пра асаблівасці сённяшняга пакалення студэнтаў, а таксама пра актуальныя спецыяльнасці і арыенціры.

— Вольга Міхайлаўна, сучасны журфак — які ён?

— Факультэт уяўляе фундаментальную школу журналістыкі, захоўваючы традыцыі, закладзеныя з дня свайго існавання, а менавіта з 1944 года. Сёння ў нас навучаецца больш за тысячу чалавек: каля 900 — на дзённым аддзяленні, 130 — на завочным. Павялічваецца колькасць замежнікаў, фактычна гэта кожны другі студэнт факультэта, пераважная большасць — з Кітая. Гэта вынік доўгатэрміновых плённых сувязяў з навучальнымі арганізацыямі КНР. Ёсць у нас і сумесныя адукацыйныя праграмы (2+2), калі пасля навучання студэнты атрымліваюць двайны дыплом: беларускі і кітайскі. Таксама адукацыю на факультэце атрымліваюць грамадзяне і з іншых краін — Расіі, Украіны, Арменіі, Казахстана, Узбекістана, Кыргызстана, Эквадора. Факультэт рыхтуе кадры для навуковай і выкладчыцкай дзейнасці — у нас вучацца каля 70 магістрантаў і 50 аспірантаў і дактарантаў. Навучальны працэс забяспечвае сем кафедраў, на якіх працуе больш за 100 прадстаўнікоў прафесарска-выкладчыцкага складу, з іх 76 маюць вучоныя ступені і званні.

«Увогуле, у тых, хто едзе ў рэгіёны, шмат пераваг. Іх там вельмі чакаюць, загадзя вырашаюць важныя пытанні — найперш з жыллём».

Новы год мы пачынаем з новымі вучэбнымі праграмамі, якія распрацаваны сумесна з заказчыкамі кадраў. Першыя два гады ўсе студэнты набываюць універсальныя кампетэнцыі, а на трэцім-чацвёртым курсах вызначаюцца з прафілізацыяй. Усім нашым студэнтам даём магчымасць выбару: захапляешся спортам — ідзі ў спартыўную журналістыку. Падабаецца дзіцячая прэса — калі ласка! Напрыклад, у вучэбныя планы па спецыяльнасці «Журналістыка міжнародная» мы заклалі англамоўныя модулі, студэнты таксама будуць мець магчымасць вывучаць дадатковую мову. Таму тым, хто паступіў да нас у гэтым годзе, вельмі пашчасціла. Многія семінары і майстар-класы праходзяць не на факультэце, а на базах філіялаў кафедраў, у медыйных кластарах, рэдакцыях, дзе выкладчыкамі выступаюць журналісты-практыкі.

Наш факультэт адным з першых у БДУ пачаў распрацоўваць навучанне з дапамогай інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. На адукацыйнай анлайн-платформе факультэта больш за 950 курсаў. Выкладчыкі публікуюць відэалекцыі, літаратуру, заданні, тэсты, абмяркоўваюць вучэбныя тэмы на форумах, у чатах. Гэта дазваляе студэнтам і выкладчыкам быць больш мабільнымі, пастаянна заставацца на сувязі і асабліва дапамагло захаваць якасны навучальны працэс у няпросты эпідэміялагічны час.

— А якія студэнты прыходзяць на журфак?

— Вельмі матываваныя хлопцы і дзяўчаты. Тут няма выпадковых. Студэнты такія ж таленавітыя, як і раней, аднак сталі больш патрабавальныя і прагматычныя. У нас на факультэце — як у сям'і: дзесьці пасварышся, дзесьці пашкадуеш і абдымеш, — свая непаўторная атмасфера. Мы імкнёмся не адставаць ад часу, бо да нас прыходзяць новыя пакаленні і ім павінна быць у нас цікава. Ад цікавасці навучання сёння залежыць эфектыўнасць.

У нас якаснае навучанне. І мне вельмі хочацца, каб студэнты ўзялі ўсё, што факультэт можа даць. Трэба разумець: чатыры гады праляцяць вельмі хутка, таму трэба зберагчы каштоўнасць кожнага імгнення, якія яны праводзяць у нас, наведваць сустрэчы, удзельнічаць у мерапрыемствах, актыўна вучыцца. У нас той факультэт, дзе не трэба запісвацца да дэкана, каб нешта даведацца ці параіцца, — дзверы заўсёды адчынены. Але разам з тым хочацца, каб студэнты самі не ўзводзілі сцены паміж намі.

— Што можаце сказаць аб прыёмнай кампаніі 2021 года?

— Набор на дзённую форму навучання па факультэце склаў 1,28 чалавека на месца. Значна павялічылася колькасць мэтавых месцаў. У мінулым годзе іх было тры, а сёлета ўжо сем. Кожнае дзясятае бюджэтнае месца на спецыяльнасцях журналісцкага профілю будзе занята студэнтам-мэтавіком. Ёсць і сумная тэндэнцыя: з кожным годам усё больш абітурыентаў пішуць творчае эсэ на рускай мове, а не на беларускай. Гэта асабістая справа кожнага, але ўпэўнена, што журналісты павінны ў аднолькавай меры добра валодаць дзвюма дзяржаўнымі мовамі. Бо сёння ты працуеш у «Звяздзе», а заўтра, напрыклад, у «СБ».

«Ёсць і сумная тэндэнцыя: з кожным годам усё больш абітурыентаў пішуць творчае эсэ на рускай мове, а не на беларускай».

— Ці ёсць праблемы з размеркаваннем выпускнікоў факультэта?

— Наадварот, нават няма такой колькасці выпускнікоў, каб задаволіць усе заяўкі. Увогуле, у тых, хто едзе ў рэгіёны, шмат пераваг. Іх там вельмі чакаюць, загадзя вырашаюць важныя пытанні — найперш з жыллём. Раней з гэтым дзе-нідзе ўзнікалі праблемы, аднак зараз пытанне на кантролі Міністэрства інфармацыі, райвыканкамаў і аблвыканкамаў . Да таго ж у рэгіёнах прапануюць прыстойны заробак і нават адразу адказныя пасады. Таму лічу, што гэта добрыя магчымасці для маладога спецыяліста, бо ў сталіцы ты вымушаны вырашаць свае пытанні самастойна.

— Цяпер актыўна абмяркоўваецца пытанне, якім павінен быць журналіст. Якое ваша меркаванне на гэты конт?

— Быць вузкім спецыялістам сёння недастаткова. Журналісту трэба і якасныя фотаздымкі зрабіць, і тэкст добры напісаць, зняць сюжэт, адаптаваць інфармацыю пад розныя каналы распаўсюджвання. Адзначу, што нашы студэнты вельмі таленавітыя: яны не толькі ствараюць кантэнт для сайтаў, газет, часопісаў, здымаюць тэлесюжэты, выходзяць у радыёэфір, спрабуюць сябе ў ролі вядучых, вядуць свае сацсеткі, але і складаюць песні, вершы, пішуць мастацкія творы. Журфак БДУ дае шмат магчымасцяў, але наколькі іх змогуць выкарыстаць студэнты, залежыць толькі ад іх жадання і матываванасці.

«Усім нашым студэнтам даём магчымасць выбару: захапляешся спортам — ідзі ў спартыўную журналістыку. Падабаецца дзіцячая прэса — калі ласка!»

Увогуле, мы за тое, каб журналісты былі рознымі: кожны са сваёй індывідуальнасцю, стылем, кірункам. Але найперш хочацца бачыць у маладых журналістаў разуменне сваёй адказнасці. Адказнасць за свае словы, за наступствы сваіх прафесійных дзеянняў перад людзьмі і краінай — тое, што павінна быць у сучаснага журналіста на першым месцы. Яны павінны разумець і прагназаваць, чым іх слова адгукнецца. Шукаць ва ўсім дрэннае — гэта лёгка, крытыкаваць, парушаць, разбураць — таксама. А вось ствараць — гэта складаней. Таму хочацца, каб журналістыка была стваральнай працай. Для таго, каб людзі чулі адно аднаго, разумелі. Журналістыка павінна садзейнічаць еднасці беларусаў дзеля развіцця роднай краіны. У гэтым місія журналіста.

— Што лічыце самым галоўным дасягненнем факультэта журналістыкі?

— Самае вялікае багацце — гэта нашы студэнты. Іх дасягненні — гэта нашы дасягненні. Для мяне заўсёды радасна, калі ў нас з'яўляецца кандыдат ці доктар навук па журналістыцы. Прыемна, калі нашы студэнты, выпускнікі атрымліваюць узнагароды, знаходзяць для сябе добрыя месцы працы. Радуюся, калі ўсе здаровыя. Хочацца, каб нашы выпускнікі, заходзячы да нас на факультэт, адчувалі сябе як дома.

— Журфак рыхтуе не толькі журналістаў. Гэта і работа з абітурыентамі, пошук таленавітай моладзі, падрыхтоўка маладых даследчыкаў і выкладчыкаў, вучоных, перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі...

— Сапраўды, наша адукацыйная дзейнасць шматаспектная. Мы на навуковым і адукацыйным узроўні ўзаемадзейнічаем з установамі вышэйшай адукацыі іншых краін, актыўна займаемся навуковымі праектамі, у тым ліку і па заказе Міністэрства інфармацыі. Пастаянна ўдасканальваем вучэбныя планы, укараняем новыя формы навучання, мяняем прынцыпы падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў. Ствараем навуковую, вучэбную і метадычную літаратуру, штогод уводзім запатрабаваныя часам новыя курсы, дысцыпліны, факультатывы. Так, за мінулы год актуалізавалася праблема верыфікацыі інфармацыі ў медыя, — і цяпер на першым курсе будзе чытацца адпаведная дысцыпліна. Рэалізоўваем цікавыя праекты разам з нашымі філіяламі і кластарамі, у тым ліку і са «Звяздой».

«Студэнты такія ж таленавітыя, як і раней, аднак сталі больш патрабавальныя і прагматычныя».

На факультэце журналістыкі рэалізоўваецца шмат міжнародных праграм. А нядаўна факультэт журналістыкі стаў членам Цэнтра еўразійскіх медыядаследаванняў МДУ імя М. В. Ламаносава. Гэтае супрацоўніцтва дазволіць навукоўцам БДУ праводзіць сумесныя даследаванні і арганізоўваць навуковыя мерапрыемствы з калегамі з розных краін, публікавацца ў міжнародных рэйтынгавых выданнях, абменьвацца навукова-метадычнымі матэрыяламі.

Дарэчы, своечасовая рэарганізацыя кафедраў палепшыла навучальны працэс на факультэце. Наша структура цяпер больш лагічная ад пачатку да падрыхтоўкі кваліфікаванага спецыяліста. Пры кафедрах працуюць студэнцкія навуковыя гурткі, лабараторыі, літаратурныя аб'яднанні. Рэгулярна праходзяць студэнцкія навуковыя канферэнцыі, конкурсы творчых работ. Створаны добрыя ўмовы для таго, каб студэнты праяўлялі сваю індывідуальнасць, энтузіязм, рэалізавалі імкненне да поспеху. Увогуле, студэнтам БДУ прапануецца шмат грантаў, праграм абмену. Калі зрэдку кажуць, што факультэт ім нічога не даў, — гэта дзіўна чуць, бо хутчэй за ўсё нехта сам нічога не ўзяў. У любым выпадку, веды за плячыма не насіць. Так, напрыклад, у нас ва ўніверсітэце дасца ўнікальная магчымасць: кожны ахвотны можа выбраць любую дысцыпліну любога факультэта, яе прайсці. Такім чынам атрымаць новыя веды і кампетэнцыі.

Сёлета наш універсітэт адзначае свой юбілей — стагоддзе, — напрыканцы падкрэсліла Вольга Міхайлаўна. — Мы да гэтага вельмі актыўна рыхтуемся. Рэалізоўваюцца цікавыя праекты, праходзяць юбілейныя мерапрыемствы. Кожны з нас шчаслівы, што мае дачыненне да БДУ. Таму што гэта наша альма-матар, вядучая ВНУ краіны, адна з самых лепшых. І гэта не проста словы тых, хто яе любіць, гэта пацвярджаецца міжнароднымі рэйтынгамі. Хочацца, каб наш універсітэт і надалей працягваў развівацца, і, безумоўна, пажадаць яму шмат новых дасягненняў на карысць нашай роднай Беларусі.

Дар'я ШЛАПАКОВА.
Фота прадастаўлена гераіняй.

Памяць

«МАЕМ НАЙБОЛЬШАЕ САМІ...»

Памёр беларускі паэт і перакладчык, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Алесь РАЗАНАЎ. Памёр 26 жніўня... На 74-м годзе жыцця.



Вялікая асоба ў беларускім прыгожым пісьменстве, беларускай літаратуры. Стваральнік новых паэтычных формаў.

Руплівы абаронца роднай мовы. Яшчэ з часін свайго студэнцтва. За што ў свой час быў звольнены з філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта...

Адна з апошніх кніг Алеся Разанава — зборнік пераўвасабленняў тэкстаў першадрукара Францыска Скарыны на сучасную беларускую мову. Гэтая кніга, якая выйшла ў «Мастацкай літаратуры», разышлася надзіва хутка, стала падзеяй у беларускім кнігавыданні.

А газета «Літаратура і мастацтва» зусім нядаўна друкавала цыкл яго мовазнаўчых вышукаў. Таксама, лічы, асобная кніга... Будзем верыць, што з часам і яна пабачыць свет.

Наватар, культуролаг, філосаф, ён пэўны адрэзак свайго жыцця аддаў літаратурнаму часопісу «Крыніца», дзе працаваў намеснікам галоўнага рэдактара. І часопіс таго часу таксама застанецца бібліятэкай з асобных нумароў, бібліятэкай беларускай культуры, беларускай літаратуры...

Яго, Алеся Разанава, пункціры, квантэмы напрыканцы 1970-х — у пачатку 1980-х гадоў шмат каму падаліся маланкай, якая трушчыць літаратурныя традыцыі. Але сумленныя паэты старэйшага пакалення, і першы сярод іх — народны паэт Беларусі Пімен Панчанка, падтрымалі маладога творцу. Так выйшла яго кніга «Шлях-360»... А першая кніга шукальніка сапраўдных, вялікіх жыццёвых і мастацкіх сэнсаў — зборнік «Адраджэнне», выдадзены ў Мінску ў 1970 годзе.

І сёння Алеся Разанава добра ведаюць у многіх краінах Еўропы. Яго паэтычныя вышукі сталі прадметам увагі перакладчыкаў на розныя мовы народаў свету.

Максім ВЕЯНІС.

ПРЫЦЯГНЕННЕ ВЕНЕРЫ

Чаму раскручваецца касмічная гонка?

NASA аб'явіла аб пачатку падрыхтоўкі дзвюх місій да Венеры, запуск намечаны на 2028—2030 гады. Акрамя ЗША, планы па адпраўцы аўтаматычных станцый ёсць у Расіі, Еўрапейскага касмічнага агенцтва і Індыі, паведаміла ria.ru. Адна з задач — пошук прыкмет жыцця. Чаму вакол Венеры раскручваецца касмічная гонка?

Савецкая планета

Першыя назіранні гэтай планеты з дапамогай аптычнага тэлескопа былі праведзены Галілеа Галілеем у 1610 годзе. Венера насамрэч на першы погляд вельмі падобная на Зямлю. Наша планета ў дыяметры большая за найбліжэйшую суседку ўсяго толькі на 638 кіламетраў. Маса Венеры складае 81 працэнт вагі Зямлі. Адпаведна, і гравітацыя «ранішняй зоркі» блізкая да зямной. Яна ўсяго ў 1,4 раза бліжэй да Сонца, чым наша планета, і венерыянскі год доўжыцца 225 зямных дзён. Зямля і Венера ўтварыліся адначасова з аднаго і таго ж рэчыва. Нібыта сам лёс наканаваў ім быць планетамі-блізнятамі. А больш за ўсё даследчыкаў інтрыгаваў той факт, што паверхня нашай суседкі закрыта суцэльнымі аблокамі, непранікальнымі для аптычных тэлескопаў. Навукоўцы імкнуліся высветліць, што хаваецца за гэтым покрывам.

У 50-х гадах мінулага стагоддзя ў СССР і ЗША пачалі вывучэнне планеты-суседкі з дапамогай радыётэлескопаў. А ўжо ў 1961-м стартаваў савецкі міжпланетны аппарат «Венера-1». Налета паляцеў амерыканскі зонд «Марынер-2». Найбольш актыўна другую ад Сонца планету даследаваў Савецкі Саюз. Арбітальныя зонды да яе запускалі і ЗША, і Еўрапейскае касмічнае агенцтва, і Японія. Але менавіта СССР па гэты дзень застаецца адзінай у гісторыі краінай, чые апараты ўваходзілі ў атмасферу Венеры і садзіліся на яе не дужа гасцінную паверхню. Упершыню ў гісторыі гэта ў 1970-м здзейсніла савецкая аўтаматычная станцыя «Венера-7». Першыя дзве «Венеры» праляцелі міма планеты. Трэцяя, магчыма, урэзалася ў яе, паколькі яшчэ да ўваходу ў атмасферу страціла сувязь з Зямлёй. Яшчэ тры «Венеры» раскрылі парашуты і пачалі спуск, але былі літаральна раздушаныя велізарным атмасферным ціскам. Савецкія канструктары вынеслі ўрок з няўдач, і пасля адбылася чарада мяккіх пасадак на планету-суседку. Іх здзейснілі «Венеры» з сёмай па чатырнаццатую, а таксама спускальныя апараты місій «Вега-1» і «Вега-2». На рахунку гэтых зондаў — першыя фатаграфіі, перададзеныя з паверхні іншай планеты (Венера тут апярэдзіла Марс), першае вывучэнне венерыянскага грунту і яшчэ шмат першага. У тым ліку і першыя лятальныя апараты ў небе іншай планеты (а менавіта аэрастаты, якія ляталі над паверхняй Венеры і перадавалі даныя на працягу амаль дзвюх зямных сутак). Бліскучыя поспехі праграмы СССР прывялі да таго, што Венеру пачалі называць «савецкай планетай».

Прыкметы жыцця

Атрыманыя даныя збянтэжылі астраномаў. Хоць Венера знаходзіцца ў найбольш спрыяльнай для зараджэння жыцця «зоне Златаўласкі», хутка высветлілася, што ўмовы там без перабольшвальня проста пякельныя. Планета, якую назвалі ў гонар багіні кахання і прыгажосці, аказалася ўжо занадта наравістай. Тэмпература на паверхні — плюс 470 градусаў, атмасферны ціск — больш за 90 атмасфер. Вада практычна адсутнічае нават у выглядзе пары. Склад аблокаў — канцэнтраваная серная кіслата.

Меркурый, Зямля, Марс, Юпітэр, Сатурн, Няптун — гэтыя планеты круцяцца вакол уласнай восі супраць гадзіннікавай стрэлкі, калі назіраць з паўночнага полюса эклiптыкі. Як і Сонца. Але Венера круціцца вакол уласнай восі ў процілеглы бок. Такім чынам, Сонца на планеце ўзыходзіць на захадзе.

Гэта звязана з тым, што планета перавернутая ў прасторы. Навукоўцы лічаць, што раней Венера магла сутыкнуцца з іншым касмічным целам, які зрушыў яе арыентацыю. Акрамя «ранішняй зоркі», ёсць яшчэ адна планета з незвычайным рухам вакол уласнай восі — гэта Уран. Ён круціцца, лежачы на баку. Верагодна, што гэта таксама звязана са сутыкненнем у мінулым.

Вар'яцкія ціск і тэмпература, аблокі з сернай кіслаты. І ўсё ж на Венеры ёсць месцы, дзе чалавеку будзе адносна камфортна. Праблема ў тым, што месцы гэтыя не на паверхні планеты. Гаворка ідзе пра вышыню 50—55 кіламетраў над паверхняй. Там атмасферны ціск складае каля адной атмасферы. Дыяпазон тэмператур цалкам камфортны для чалавека, а не такі пякельны, як каля паверхні, — ад 0 да 50 градусаў па Цэльсіі. Абарону ад касмічнай радыяцыі будзе забяспечваць атмасфера вышэй, шчыльнасць якой эквівалентная зямной. Гравітацыя блізкая да нашай планеты. Людзям давялося б жыць у паветраных гарадах, што вельмі складана тэхнічна на цяперашнім этапе развіцця тэхналогій. Тэарэтычна чалавек зможа «выйсці на паверхню» на вышыні 50 кіламетраў у звычайным аквалангу, паколькі ціск блізкі да зямнога.

Усвядоміўшы, што шукаць жыццё на Венеры дарэмна, навукоўцы страцілі да яе цікавасць. Надышоў працяглы перыяд забыцця. NASA не адпраўляла туды апараты больш за 30 гадоў — пасля станцыі «Магелан», якая ў 1989-м выканала з арбіты падрабязнае радыёлакацыйнае картаграфаванне планеты. Савецкія «Вега-1» і «Вега-2» даставілі на Венеру пасадачныя модулі і аэрастатныя зонды ў 1985-м. Пасля гэтага там працавалі толькі арбітальныя станцыі «Венера-экспрэс» Еўрапейскага касмічнага агенцтва (ЕКА) і «Акацукі» Японскага агенцтва аэракасмічных даследаванняў (JAXA).

Але некалькі гадоў таму ў атмасферы Венеры выявілі патэнцыяльны маркер жыцця — газ фасфін, які вырабляецца на Зямлі анаэробнымі бактэрыямі. Даныя, атрыманыя з дапамогай інфрачырвонага тэлескопа Джэймса Кларка Максвела (JCMT) на Гаваях у 2017-м і комплексу радыётэлескопаў ALMA ў чылійскай пустыні Атакама ў 2019-м, адразу пачалі пераправяраць іншыя даследчыкі, і іх высновы былі не такімі адназначнымі. Адны знайшлі памылкі ў апрацоўцы вынікаў назіранняў, іншыя паказвалі на тое, што з-за няправільнай каліброўкі інтэрферарметрыі фасфін пераблыталі з сярністым газам, спектральная лінія якога зусім побач.

Афіцыйны сайт Еўрапейскай паўднёвай абсерваторыі, аднаго з галоўных партнёраў ALMA, паведаміў аб перакаліброўцы даных з навуковага архіва назіранняў, а аўтары нашумелага артыкула прызналі, што завысілі ўтрыманне фасфіну ў атмасферы Венеры па меншай меры ў сем разоў. Тым не менш усе місіі, якія стартуюць у найбліжэйшы час, уключылі ў спіс задач пошукі прыкмет жыцця.

Прыярытэтныя місіі

Першым павінен паляцець індыйскі арбітальны апарат «Шукраян-1» (у перакладзе — «Карабель Венеры»). Для старту плануюць скарыстацца адным з найбліжэйшых палётных вокнаў — у снежні 2024-га або ў сярэдзіне 2026-га, у залежнасці ад таго, калі завершыцца распрацоўка. Асноўныя мэты місіі — скласці карту паверхні і нетраў Венеры, даследаваць хімічны склад атмасферы і яе ўзаемадзеянне з сонечным ветрам.

Мяркуецца, што раздзяленне двухчастотнага радара з сінтэзаванай апертуры, размешчанага на борце «Шукраян-1», будзе ў чатыры разы большае, чым у арбітальнага апарата NASA «Магелан» — галоўнага «картографа» Венеры. Дзякуючы геарадару, індыйская місія стане першай па вывучэнні нетраў планеты. У спісе прыбораў таксама прылады для аналізу атмасферы Венеры ў інфрачырвоных, ультрафіялетавых і субміліметровых хвалях. Так што ў індыйскага апарата ёсць усе шанцы выявіць фасфін, калі ён там сапраўды ёсць. Інфрачырвоны спектрометр спатрэбіцца і для выяўлення магчымых вулканічных працэсаў.

Еўрапейскае касмічнае агенцтва (ЕКА) разглядае магчымасць запуску ў 2030 годзе да Венеры місіі EnVision, якая будзе арбітальнай, але зробіць карты асобных участкаў планеты з раздзяленнем да аднаго метра. Пры такой дэталізацыі, напрыклад, можна ўбачыць савецкія пасадачныя модулі. Акрамя таго, спецыяльны спектрометр прааналізуе святло вызначанай даўжыні хвалі, які праходзіць скрозь вуглекіслотную смугу. Навукоўцы спадзяюцца, што гэта дазволіць скласці першае ўяўленне аб складзе парод планеты, па меншай меры адрозніць граніты ад базальтаў і такім чынам высветліць, ці ёсць у венерыянскай літасферы, як у зямной, падзел на блокі кантынентальнай і акіянічнай кары.

У лютым у NASA зацвердзілі чатыры праекты праграмы даследавання Сонечнай сістэмы Discovery. Два датычацца Венеры, а два іншыя прысвечаны спадарожнікам планет-гігантаў — Іа (Юпітэр) і Трытон (Няптун). Пасля місіі да Венеры прызналі прыярытэтнымі і на кожную вылучылі па 500 мільёнаў долараў. Праект DAVINCI + (Deep Atmosphere Venus Investigation of Noble gases, Chemistry, and Imaging Plus) прадугледжвае адпраўку да Венеры касмічнага апарата нова-га пакалення. Усе прыборы яго пасадачнага зонда заключаны ў спецыяльную сферу, яны вытрымліваюць пралёт скрозь гарачую і шчыльную атмасферу планеты. Зонд прааналізуе склад атмасферы Венеры ад самых верхніх пластоў да паверхні, удзяляючы асаблівую ўвагу інертным газам і іншым злучэнням, здольным растлумачыць прыроду парніковага эфекту на планеце.

Спуск будзе здымаць сістэма з чатырох камер, адчувальных да ўльтрафіялетавага і бліжняга інфрачырвонага святла. Навукоўцы таксама спадзяюцца з дапамогай гэтых камер атрымаць у высокім раздзяленні здымкі загадкавых элементаў паверхні Венеры, так званых тэсераў, якія, на думку некаторых даследчыкаў, могуць стаць ключом да разумення гісторыі планеты і дазволяць адказаць на пытанне, ці існавалі калі-небудзь тут моры і акіяны, дзе патэнцыйна магло зарадзіцца жыццё. У выпадку поспеху зонд DAVINCI+ стане першым з 1985 года спускальны апаратам на Венеры пасля савецкіх «Вега-1» і «Вега-2».

У межах другой місіі — VERITAS (Venus Emissivity, Radio Science, InSAR, Topography, and Spectroscopy) NASA адправіць на арбіту Венеры апарат з магутнымі радыёлакацыйнымі прыборамі, здольнымі назіраць скрозь шчыльную атмасферу, картаваць паверхню планеты і шукаць прыкметы актыўных працэсаў — тэктонікі пліт і вулканізму. Інфрачырвоныя прыборы на борце апарата змогуць вызначаць склад парод на паверхні. Гэта дазволіць пабудаваць першую геалагічную карту планеты, зразумець гісторыю Венеры і прыроду яе адрозненняў ад Зямлі. З дапамогай прыбора InSAR пабудуюць трохмерную тапаграфічную мадэль.

«Тостар» на арбіце

Запуск расійскай аўтаматычнай міжпланетнай станцыі «Венера-Д», якая ўключае ў сябе арбітальны апарат і пасадачны модуль для комплекснага вывучэння атмасферы, паверхні, унутранага ўладкавання планеты і навакольнага касмічнай плазмы, запланаваны на 2029-ты. Літара «Д» у назве азначае «доўгажывучы». Па разліках распрацоўшчыкаў, сам пасадачны модуль, які будзе падобны на спускальны апарат «Вега», прабудзе на паверхні планеты не больш за два-тры гадзіны, але ён даставіць станцыю LLISSE, якая павінна прапрацаваць не менш за 60 сутак. Папярэдні рэкорд належыць «Венеры-13» — каля дзвюх гадзін.

Хоць LLISSE па памерах — з бытавы тостар, прыбор, па задумцы спецыялістаў, зможа некалькі месяцаў рэгістраваць мноства параметраў: тэмпературу, ціск, хуткасць і напрамак ветру, колькасць сонечнай энергіі, якая паступае да паверхні, і некаторых рэчываў у ніжніх пластах атмасферы. Акрамя таго, канфігурацыя місіі «Венера-Д» мае ўстаноўку для свідравання, мяркуецца і запуск аэрастатнага зонда для пошуку біямаркераў у адзіна патэнцыйна прыдатным для жыцця венерыянскім асяроддзі — атмасферы.

У касмічную гонку ўключылася і амерыканская прыватная касмічная кампанія Rocket Lab. Яе кіраўнік Пітэр Бэк асабліва захоплены Венерай і ўжо абвясціў, што плануе адправіць туды касмічны апарат у 2023 годзе. Ён кажа, што кампаніі па сілах самастойна прафінансаваць праект і пабудаваць касмічны апарат. Rocket Lab ужо стварыла модуль «Фатон», які запускаецца пры дапамозе носьбіта «Электрон». Пітэр Бэк плануе скінуць з арбіты на Венеру зонд вагой 37 кілаграмаў. Пралятаючы праз венерыянскую атмасферу, ён будзе перадаваць сабраныя даныя па радыё на «Фатон», а той, у сваю чаргу, на Зямлю. «Гучыць не вельмі ўражліва, але на самай справе 37 кілаграмаў — гэта процьма прыбораў, асабліва калі вы загадзя ведаеце, што шукаеце і хочаце замерыць, — сказаў Бэк Бі-бі-сі. — Венера апошнім часам была абдзелена нашай любоўю. Я мяркую, што 2023 год — шанц гэта выправіць. Урады не ўмеюць паварочвацца хутка, а прыватнае прадпрыемства можа. Мы здольныя паляцець туды за невялікія грошы, паўтарыць гэта шмат разоў, зрабіць некалькі заходаў і праверыць атрыманыя вынікі».

Пілатуемыя місіі да Венеры нікто не плануе. Людзям там пакуль рабіць няма чаго. Аднак можна зірнуць на планету бліжэй падчас іншага палёту. Такі варыянт прапанавалі ў NASA. Большасць праектаў місій марсіянскай праграмы прадугледжваюць аблёт Венеры для манеўру і набору хуткасці. Гэта збіраюцца выкарыстоўваць для цэлай серыі эксперыментаў, якія вельмі цяжка правесці дыстанцыйна. Навукоўцы жартам назвалі такі падыход «дзве планеты па цане адной». Такім чынам магчыма даставіць да Венеры аналітычныя апараты і зонды, якія кіруюцца з арбіты, а таксама сабраць і вярнуць на Зямлю пробы паветра і грунту.

Захар БУРАК.

ЗАО «БелБанкротАукцион»,
организатор торгов по продаже имущества
ОАО «Берестовицкая ПМК № 141» (УНП 500020631),
объявляет о проведении 13.09.2021 **г.**
в 09.00 **публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке**
bankrottorg.by

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2021/08/spisok-imushhestva-berestovicz kaya-pmk-141-na-torgi-13.09.21.pdf

Местонахождение имущества: Гродненская область, Берестовицкий район, г. п. Большая Берестовица, пер. Советский, д. 7.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: ОАО «Берестовицкая ПМК № 141», тел. +37529 3923903.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **10.09.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 30.08.21** по **17.00 10.09.21** на bankrottorg.by. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения.
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; аукционный сбор по лоту 1–125 – 7 % от цены реализации предмета торгов; по остальным лотам 2 % от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение пятнадцати календарных дней со дня проведения аукциона.

Урачыстасць

АБРАЛІ ГАНАРОВЫ ШЛЯХ

Курсанты-першакурснікі Акадэміі МУС прынялі прысягу на вернасць Беларусі і яе народу

Гэтыя вельмі важныя словы навабранцы галоўнай міліцэйскай альма-матар краіны вымавілі на плошчы Дзяржаўнага сцяга. Сёлета шэрагі акадэміі папоўніла звыш 440 курсантаў, у тым ліку каля 20 дзяўчат.

Усе яны ўжо прайшлі курс маладога байца. За месяц засвоілі агнявую, страявую і фізічную падрыхтоўку, атрымалі тэарэтычныя першапачатковыя веды, якія спатрэбяцца ім у прафесіі. Цвёрда ўпэўненыя ў правільнасці свайго выбару, юнакі і дзяўчаты прынялі ўдзел у адной з галоўных урачыстасцяў свайго жыцця.

Як адзначыў **намеснік міністра ўнутраных спраў генерал-маёр міліцыі Сяргей ХАМЕНКА,** сярод усіх міліцэйскіх рытуалаў прыняцце прысягі з'яўляецца самым хвалюючым, які запамінаецца на ўсё жыццё ў найдрабнейшых дэталях. «Вымавіўшы слова «клянуся», вы сёння ўсклалі на сябе самую высокую адказнасць за абарону жыцця і здароўя людзей, павагу іх праваў і свабод, — звярнуўся да курсантаў прадстаўнік сілавога ведамства. — Гэта клятва вернасці нашай роднай Беларусі назаўсёды застанецца ў вашых сэрцах, будзе вашым надзейным арыенцірам у службе».

Сяргей Хаменка падкрэсліў, што сёння ў Акадэмію МУС паступілі найлепшыя прадстаўнікі маладога пакалення. «Гэта адказ тым зласліўцам, якія кажуць аб зніжэнні іміджу беларускай міліцыі, — удакладніў намеснік міністра. — Гэтыя людзі валодаюць ведамі, яны фізічна развітыя, а ў іх вачах — імкненне палепшыць жыццё».

Каб павіншаваць хлопцаў і дзяўчат з прыняццем прысягі, на плошчы Дзяржаўнага сцяга сабраліся родныя і блізкія, а таксама сябры ўчарашніх школьнікаў.

— Паступіўшы ў Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў, вы сталі на вахту па ахове закона, — акцэнтавала ўвагу новага папаўнення мама курсанта Алеся Лябедзік. — Вы заўсёды павінны памятаць, што галоўны абавязак супрацоўніка сілавога блока — мець халодны розум, гарачае сэрца і крыштальна чыстае сумленне, верна і шчыра служыць народу. Гледзячы на гэтыя стройныя шэрагі, мы, вашы бацькі, адчуваем вялізны гонар і радасць: вы абралі нялёгкі, але вельмі гаяровы шлях — служыць свайму народу, сваёй Радзіме.

Сярод іх — і Мікіта Лукашэвіч. Калі паўстала пытанне аб будучай прафесіі, малады чалавек ніколькі не вагаўся: перад ім быў заўсёды прыклад — бацька. Участковага, якога ў акрузе, дзе ён служыў, называлі сучасным Аніськіным, вельмі любілі і паважалі людзі, бо ён заўжды прыходзіў на дапамогу. На жаль, афіцэр міліцыі падчас выканання службовых абавязкаў загінуў. Сёння бацькаву справу працягвае яго сын.

— Дынастыя не спыняецца ўжо ў трэцім пакаленні: дзядуля Мікіты ў мінулым — палкоўнік міліцыі, — расказвае Наталля Лукашэвіч, мама курсанта. — Мы не настойвалі, каб па гэтым шляху пайшоў і сын, аднак ён сам прыняў рашэнне, і мы яго толькі падтрымліваем.

Словы прысягі ўчора вымавілі яшчэ і курсанты Магілёўскага інстытута МУС. Сярод тых, хто прыняў рашэнне служыць у міліцыі, — нямала прадаўжальнікаў сямейных дынастый супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, а таксама выпускнікоў кадэцкіх вучылішчаў.

— Міліцэйская прафесія прад'яўляе да вас, хто прысвяціў сябе справе барацьбы са злачыннасцю, асаблівыя патрабаванні, — павіншаваў навабранцаў з прыняццем прысягі **намеснік міністра ўнутраных спраў генерал-маёр міліцыі Генадзь КАЗАКЕВІЧ.** — Супрацоўнік павінен быць усебакова развітым, прынцыповым і патрабавальным да сябе і навакольных, непрымірымым да фактаў парушэння закона, а таксама гуманным і справядлівым, смелым у хвіліну небяспекі, хуткім у прыняцці рашэння.

Чатыры гады навучання праляцяць вельмі хутка, і сённяшнія навабранцы зноў збяруцца на плошчы Дзяржаўнага сцяга, дзе ім будзе прысвоена першае афіцэрскае званне. А пакуль у добры шлях!

Вераніка КАНЮТА.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «СДСК»** (УНП 400024628) 247439, Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 10, в лице антикризисного управляющего ООО «Правовая стратегия», тел. + 375 (17) 396-61-34.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **14 сентября 2021 г. 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

№ п/п	Предмет торгов, местонахождение	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Грузовой специальный бетоносмеситель, КАМАЗ 65115 D3 АБС-7ДА, 2008 г/в, цвет оранжевый, кузов № 2117050 XTC65115381163312	27360,00
2	Грузовая цистерна, ГАЗ 3309 АТЗ 36135-011, 2005 г/в, цвет белый, кузов № X9036135A50004267, рег. № АА 3802-3	23328,00
3	Погрузчик с телескопической стрелой, Амкодор 527, 2008 г/в, заводской № Y3A527 11080075, марка двигателя Д-245 № 412327	42816,00

Местонахождение – г. Светлогорск, ул. Заводская, 10,
тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 30.08.2021 г. 09.00 по 13.09.2021 г. 17.00:

1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о проведении торгов было опубликовано в газете «Звязда» 23.07.2021 г.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона)
извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества
ОАО «Торфопредприятие Глинка» (Продавец)

Лота № 1: Автовесовая, инв. № 135/С-14578, 141 кв. м.

Адрес: Брестская обл., Столинский р-н, Радчицкий с/с, д. Колодное, ул. Заводская, 2/3.
Земельный участок: кадастровый номер 125885201601000115, площадь – 2,6560 га.
Начальная цена, бел. руб., с НДС – 80 271,07. **Задаток, бел. руб.** – 8 027,10.

Лота № 2: Проходная, инв. № 135/С-14323, 18,4 кв. м.

Адрес: Брестская обл., Столинский р-н, Радчицкий с/с, д. Колодное, ул. Заводская, 2/2.
Обременение: аренда.
Земельный участок: кадастровый номер 125885201601000115, площадь – 2,6560 га.
Начальная цена, бел. руб., с НДС – 6 189,10. **Задаток, бел. руб.** – 618,91.
Шаг аукциона – 5 %. Штраф: Лот № 1 – 10 000,00, Лот № 2 – 2 700,00.

Аукцион состоится 29.09.2021 в 11.00
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – 27.09.2021 в 11.00.

☎ Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Додомания»

Сведения о рекламной игре:

Наименование рекламной игры: **«Додомания».**

Территория проведения: сеть ресторанов быстрого обслуживания «Додо Пицца» на территории Республики Беларусь.

Период проведения: с 1 июня 2021 г. по 31 августа 2021 г.

В рекламной игре приняли участие 586 участников.

Призовой фонд игры разыгран полностью.

Обладателем 1 (одного) приза «Смартфон Huawei P40 Lite (JNY-LX1) ярко-зеленый (863797053537921) и денежные средства в размере 82,03 белорусских рубля» стал Логвиненко Евгений Андреевич.

Обладателем 1 (одного) приза «Смартфон Huawei P40 Lite (JNY-LX1) ярко-зеленый (863797053537111) и денежные средства в размере 82,03 белорусских рубля» стала Денисовец Александра Михайловна

Обладателем 1 (одного) приза «Смартфон Huawei P40 Lite (JNY-LX1) ярко-зеленый (863797053541816) и денежные средства в размере 82,03 белорусских рубля» стал Юркевич Артем Николаевич.

Обладателями 10 (десяти) призов «Беспроводные наушники Huawei FreeBuds 4i Ceramic White (T0001) и денежные средства в размере 19,28 белорусских рублей» стали:

№	ФИО	№	ФИО
1	Галезник Наталья Николаевна	6	Китова Ирина Алексеевна
2	Свистунова Катерина Николаевна	7	Стибло Ольга Витальевна
3	Трот Михаил Васильевич	8	Колубако надежда Петровна
4	Касперович Николай Владимирович	9	Чернявская Евгения Федоровна
5	Смирнов Денис Дмитриевич	10	Филимоненко Максим Олегович

Обладателями 10 (десяти) призов «Умный браслет Huawei Band 4e AW70 Розовый коралл» стали:

№	ФИО	№	ФИО
1	Бондарева Валерия Юрьевна	6	Стибло Ольга Витальевна
2	Шагун Ольга Генриховна	7	Кучинская Галина Николаевна
3	Нарчук Ирина	8	Гостенков Егор Анатольевич
4	Киринович Татьяна Степановна	9	Груша Ирина Александровна
5	Марных Татьяна Борисовна	10	Гомолко Антон Сергеевич

Обладателями 6 (шести) призов «Устройство считывания с карты Huawei 2-in-1 Card Reader» стали:

№	ФИО	№	ФИО
1	Гром Кирилл Кириллович	4	Карунус Ирина Петровна
2	Наумчик Вероника Викторовна	5	Москалев Олег Юрьевич
3	Горбачук Дмитрий Андреевич	6	Ковалев Кирилл Александрович

Обладателями 2 (двух) призов «Велосипед Racer Olivia 26 бирюзовый 2020 рост 18 и денежные средства в размере 22,41 белорусских рубля» стали: Груша Ирина Александровна, Адамович Ирина Владимировна.

Обладателем 1 (одного) приза «Велосипед Racer Boxfer 29 черно-оранжевый 2021 рост 20 и денежные средства в размере 31,38 белорусский рубль» стала Исакова Алина Михайловна.

Обладателями 20 (двадцати) призов «Замок на ключ RACER GD11-1006 8*1500» стали:

№	ФИО	№	ФИО
1	Стрельский Александр Васильевич	11	Германович Елена Ивановна
2	Любименко Олег Игоревич	12	Кречу Дмитрий Петрович
3	Дребезова Мария Владимировна	13	Вольская Наталья Владимировна
4	Миклуш Павел Сергеевич	14	Бондарчук Татьяна Григорьевна
5	Будько Ирина Владимировна	15	Ключник Ольга Сергеевна
6	Денисовец Александра Михайловна	16	Екамова Мария Денисовна
7	Куплевич Иван Александрович	17	Панков Владимир Владимирович
8	Машнин Александр Игоревич	18	Струнов Виктор Андреевич
9	Беляков Владимир Владимирович	19	Николайчик Янина Михайловна
10	Миранович Александра Юрьевна	20	Гаврилина Ольга Юрьевна

Организатором Рекламной игры является ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ», Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18б, к. 25, пом. 701, УНП 190771520.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3997 от 27.05.2021, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375 29 606 75 76 с 11.00 до 23.00 ежедневно (без выходных), сайт www.dodopizza.by.

Правила рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» № 100 от 29.05.2021.

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Встречай любимую вкуснятину в новом дизайне и выигрывайте призы! Тур 1»

Сведения об организаторе – является Общество с ограниченной ответственностью «ЭфСиБи Бел» (далее – Организатор), УНП 193185741.

Юридический адрес: Республика Беларусь, 220037, г. Минск, пер. Козлова, д. 25, пом. 22.

Территория проведения рекламной игры: магазины «АЛМИ» на территории Республики Беларусь.

Срок начала рекламной игры: 06.08.2021.

Срок окончания рекламной игры: 31.08.2021.

Сведения о государственной регистрации рекламной игры: свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4041 от 20.07.2021, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Сведения о количестве участников рекламной игры: 209 участников.

В рекламной игре разыгрывалось: 100 Гарантированных призов 1 «Felix. Аппетитные кусочки. Корм конс. полнорац. для взрослых кошек, с курицей в желе, 85 г в количестве 24 штук»; 100 Гарантированных призов 2 «Felix Sensation в желе. Корм конс. полнорац. для взрослых кошек, с уткой в желе со шпинатом, 85 г в количестве 24 штук»; 100 Гарантированных призов 3 «Felix. Аппетитные кусочки. Двойная вкуснятина. Корм конс. полнорац. для взрослых кошек, с говядиной и домашней птицей в желе, 85 г в количестве 24 штук», а также 1 Главный приз 1 (состоит из: Xbox One S 1 ТБ STAR WARS JEDI FALLEN ORDER, Пакета Xbox Game Pass Ultimate на 12 мес + 1 месяц (с момента активации) и Денежного вознаграждения (подоходный налог) в размере 193,38 белорусских рублей); 1 Главный приз 2 (состоит из: Электросамоката Xiaomi Electric Scooter 1S EU/FBC4019GL (черный) и Денежного вознаграждения (подоходный налог) в размере 201,72 белорусских рублей); 1 Главный приз 3 (состоит из: Смартфона iPhone 12, 128 GB, Blue и Денежного вознаграждения (подоходный налог) в размере 440,66 белорусских рублей).

Призовой фонд был разыгран частично. Было разыграно 100 Гарантированных призов 1 «Felix. Аппетитные кусочки. Корм конс. полнорац. для взрослых кошек, с курицей в желе, 85 г в количестве 24 штук»; 100 Гарантированных призов 2 «Felix Sensation в желе. Корм конс. полнорац. для взрослых кошек, с уткой в желе со шпинатом, 85 г в количестве 24 штук»; 9 Гарантированных призов 3 – «Felix. Аппетитные кусочки. Двойная вкуснятина. Корм конс. полнорац. для взрослых кошек, с говядиной и домашней птицей в желе, 85 г в количестве 24 штук», а также были разыграны 1 Главный приз 1 (состоит из: Xbox One S 1 ТБ STAR WARS JEDI FALLEN ORDER, Пакета Xbox Game Pass Ultimate на 12 мес. + 1 месяц (с момента активации) и Денежного вознаграждения (подоходный налог) в размере 193,38 белорусских рублей); 1 Главный приз 2 (состоит из: Электросамоката Xiaomi Electric Scooter 1S EU/FBC4019GL (черный) и Денежного вознаграждения (подоходный налог) в размере 201,72 белорусских рублей); 1 Главный приз 3 (состоит из: Смартфона iPhone 12, 128 GB, Blue и денежного вознаграждения (подоходный налог) в размере 440,66 белорусских рублей).

Победители: полная информация о победителях Рекламной игры и их выигрышах опубликована по ссылке https://promo-cat.by.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375 (44) 522 88 00. Время работы горячей линии: с 10.00 до 18.00 пн.–пт., с 12.00 до 13.00 сб.

Открытый аукцион № 17/21

ПО ПРОДАЖЕ АЗС-КОМПЛЕКСА в Минской области

Организатор аукциона: ООО «Реалконсалтинг», ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. г. Минск, 220015, РБ, тел. + 375 (17) 256-61-35.
Продавец – СООО «ЭКСПРЕСС-СЕРВИС-БРАМА+»

Аукцион состоится 30.09.2021 в 11.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, п. 701

Лот № 1 в составе:

1. Капитальное строение с инвентарным номером 622/С-43390, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Столбцовский р-н, М-1, 277-й км, 2, здание АЗС, площадь – 0,0 кв. м, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – АЗС-комплекс, расположенное на земельном участке с кадастровом номером 625400000012000808 площадью 4,7500 га.

